Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

28 ВЕРАСНЯ 2023 г. ЧАЦВЕР № 188 (30068)

ДАЛУЧЫЦЦА ДА ТРАДЫЦЫЙ НАШЫХ ПРОДКАЎ

Сямейная справа

ЯК АДАРВАЦЬ ДЗЯЦЕЙ АД ГАДЖЭТАЎ

Сямейная справа

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір ПЯРЦОЎ, міністр інфармацыі:

«Беларускі бок падзяляе падыходы ШАС да супрацьдзеяння аднапалярнаму свету, пратэкцыянізму і гандлёвым войнам, зацікаўлены ў нарошчванні новых міжнародных транспартных калідораў, гатовы супрацоўнічаць у галіне гуманітарных праектаў. У медыягаліне ў Беларусі з многімі ўдзельнікамі краін ШАС ужо выбудаваны доўгатэрміновы і перспектыўны вектар развіцця. Сёння вядучыя дзяржаўныя СМІ Беларусі ў рамках існуючых дамоўленасцяў актыўна ўзаемадзейнічаюць з найбуйнейшымі медыярэсурсамі Расійскай Федэрацыі, КНР, Казахстана, Кыргызстана, Таджыкістана, Узбекістана, Пакістана, Індыі і Ірана. Упэўнены, што будучыня нашай сумеснай дзейнасці — у надзейным і ўзаемавыгадным інтэграцыйным партнёрстве».

Скарынава шахта



Салігарчанін Аляксандр СКАРЫНА 35 гадоў адпрацаваў пад зямлёй. Аляксандр з нуля сабраў шахцёрскую брыгаду і паставіў рэкорд па здабычы руды. Упартасць і працавітасць дазволіла шахцёрам літаральна горы звярнуць. За 35 гадоў Аляксандр Яўгенавіч настолькі прывык да падземных тунэляў, што, калі прыйшоў час выйсці на пенсію, доўга не мог гэтага зрабіць. Ён — заслужаны ветэран працы ААТ «Беларуськалій», поўны кавалер знака «Шахцёрская слава», узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі». З гонарам носіць званне «Заслужаны шахцёр Рэспублікі Беларусь».

КАРАТКА

- **У Беларусі намалочана 7,7 млн тон збожжа з улікам рапсу.**
- Прафілактычная акцыя «Цвярозы вадзіцель» пройдзе ў Мінскай вобласці з 28 верасня да 1 кастрычніка.
- **Пажылыя людзі змогуць бясплатна наведаць Нацыянальны мастацкі музей 30 верасня.**
- Ліміт бяспошліннага ўвозу тавараў фізічнымі асобамі ў ЕАЭС у памеры 1 тыс. еўра і 31 кг працягнуты да 1 красавіка 2024 года.

ISSN 1990 — 763X

У сваёй акрузе

«ЛЮДЗІ ЧАКАЮЦЬ»

Адзін дзень дэпутата ў рэгіёне

На працягу тыдня штомесяц дэпутат Палаты прадстаўнікоў Жанна ЧАРНЯЎСКАЯ прысвячае рабоце ў сваёй выбарчай акрузе. Асабістыя прыёмы грамадзян, прамыя тэлефонныя лініі, выязныя сустрэчы з выбаршчыкамі, наведванне сацыяльна значных аб'ектаў — графік парламентарыя заўсёды насычаны... Карэспандэнт «Звязды» правяла адзін дзень з дэпутатам у Хойніцкім раёне і пераканалася: справа гэта няпростая, але ўдзячная.

Дэпутат Жанна ЧАРНЯЎСКАЯ падчас наведвання прадпрыемства «Спецславія» ў Хойніцкім раёне.

СТАР. 4

Разумныя грошы

Скарбонка дабрабыту

Якія працэнты па дэпазітах і даходнасць каштоўных папер?

Многія з нас імкнуцца эканоміць, каб захаваць грошы для падушкі бяспекі і буйных пакупак. Праўда, не заўсёды атрымліваецца зберагчы свае назапашванні проста так — заўсёды з'яўляецца неабходнасць у тэрміновых тратах, пасля якіх уся зарплата проста «растворыцца» ў дробных пакупках. Існуе жалезнае правіла назапашвання грошай. Трэба з кожнага даходу адкладаць 10—15 %. Атрымалі зарплату — адкладайце дзясятую частку на назапашвальны рахунак, прыйшоў ганарар за падпрацоўку — пакладзіце 10 % на дэпазіт. Калі ж хочаце хутка назапасіць на буйную куплю, то назапашваць трэба больш — ад 30 да 40 % ад усякага даходу. Колькі трэба адкладаць, мы разабраліся, цяпер удакладнім — куды?

ЛЕПШ ЗА ЎСЁ БЕЗАДЗЫЎНЫ

Варыянтаў мноства, але яны залежаць ад сумы вашых накапленняў. Самы першы, які прыходзіць у галаву большасці і даступны ўсім, — адкрыць дэпазіт. Але не ўсё так проста, бо тэндэнцыі змяняюцца. Давайце разбяромся, якія бываюць банкаўскія ўклады і колькі можна на гэтым зарабіць.

Укладаў дзеляцца на дзве асноўныя катэгорыі — адзыўныя і безадзыўныя. Адзыўны дэпазіт афармляецца на пэўны тэрмін, але пры жаданні вы можаце ў любы момант забраць свае грошы — цалкам або часткова. Ужо за саму магчымасць у любы час пакарыстацца сваімі грашыма кліент банка расплачваецца паніжанымі працэнтамі. Самы выгадны адзыўны дэпазіт тэрмінам ад месяца да года прадугледжвае 1—7 % гадавых. Гэта значна менш, чым па стаўцы безадзыўнага ўкладу.

СТАР. 4

Захаваць гістарычную спадчыну

Якая роля ў гэтым органаў мясцовага кіравання і самакіравання

Фота БелТА.

У Гродне тэму абмеркавалі ўдзельнікі выязнога пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага кіравання і самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі з удзелам Наталлі КАЧАНАВАЙ.

Старшыня Савета Рэспублікі акрэсліла тэматыку выязнога пасяджэння як надзвычай актуальную. Захаванне гістарычнай памяці як асновы духоўнага і маральнага выхавання падрастаючага пакалення — гэта тое, што сёння хвалюе грамадства.

— Захаванне нашай гісторыі базіруецца, у першую чаргу, на праўдзе. Сіла — у праўдзе. Наша краіна мае глыбокія карані дзяржаўнасці. І гэта трэба данесці не толькі да нашага, але і сусветнага грамадства. Мы шмат увагі ўдзяляем гістарычнай праўдзе аб трагічных падзеях, якія адбываліся на нашай зямлі, і мы ўдзячныя тым, хто сёння займаецца гэтай працай. Сёння з'яўляюцца новыя факты генацыду беларускага народа, якія адбываліся на нашай зямлі. Таму мы павінны зрабіць усё, каб захаваць гэту памяць, данесці яе да тых, хто ідзе за намі, — зазначыла Наталля Качанава.

Аб тым, якая работа вядзецца ў Гродне для захавання духоўных і культурных традыцый, удзельнікі пасяджэння даведаліся пры наведванні некаторых аб'ектаў. Адным з іх стала гімназія № 10, якой летась прысвоена імя мітрапаліта Філарэта. Працягам духоўных традыцый стала стварэнне тут рэсурснага цэнтра «Беларусь. Лёс. Айчына». Дырэктар гімназіі Алена Зінчук бачыць галоўнай мэтай сваёй установы развіццё духоўнасці і патрыятызму маладога пакалення. Гэтаму спрыяе і шэраг праектаў, якія рэалізоўваюцца ў гімназіі, у першую чаргу медыяцэнтр, які стаў платформай для адукацыйных і духоўных сайтаў.

Спікер верхняй палаты парламента высока ацаніла дзейнасць патрыятычнага клуба і запрасіла яго ўдзельнікаў наведаць Савет Рэспублікі. У якасці падарунка гімназіі быў уручаны сертыфікат на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы.

Таксама ўдзельнікі пасяджэння наведалі Цэнтр рамёстваў «Спадчына» Гродзенскага гарадскога цэнтра культуры. Аб захаванні народных традыцый сведчаць выставачныя экспазіцыі. Парламентарыі змаглі пазнаёміцца з традыцыйнымі народнымі промысламі, многія з якіх уваходзяць у спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі.

— Трэба больш звяртаць увагі на нашы гістарычныя карані, нашу духоўнасць, каб у моладзі быў гонар за нашу краіну. А нам ёсць чым ганарыцца, — падкрэсліла Наталля Качанава падчас пасяджэння савета.

На яе думку, вучні павінны ведаць гісторыю не толькі па падручніках. Варта арганізоўваць паездкі па знакавых месцах Беларусі, дзе захаваліся гістарычныя аб'екты, месцы, якія звязаны з важнымі гістарычнымі падзеямі. Такая работа павінна насіць сістэмны характар. Таксама спікер верхняй палаты станоўча ацаніла ўвядзенне новага прадмета для старшакласнікаў «Гісторыя Беларусі ў кантэксце Сусветнай гісторыі», якая ініцыіравана Міністэрствам адукацыі. А для 1—4 класаў падрыхтаваны падручнік «Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны», які з'явіцца ў школах у кастрычніку гэтага года. «Педагогі павінны выконваць яшчэ і выхаваўчую функцыю, — лічыць Наталля Качанава, — каб чалавек быў не толькі адукаваным, але і патрыётам сваёй краіны».

Больш падрабязна аб рабоце выязнога пасяджэння Савета — у наступным выпуску «Мясцовага самакіравання».

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Рэха падзеі

Голас Беларусі гучыць моцна і пераканаўча

Парламентарыі расказалі аб выніках сустрэч і выступленняў на пляцоўках ААН

18—19 верасня ў рамках 78-й сесіі Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у Нью-Ёрку праходзіў Саміт па Мэтах устойлівага развіцця. Па запрашэнні Генеральнага сакратара ААН у гэтай буйной міжнароднай палітычнай падзеі прымала ўдзел і дэлегацыя з Беларусі, што сведчыць аб высокай ацэнцы поспехаў нашай краіны ў дасягненні Мэт устойлівага развіцця (МУР).

Усяго ў дыскусіях (а іх было шэсць) удзельнічала амаль 160 кіраўнікоў дзяржаў, урадаў, міністэрстваў са 193 краін — удзельніц ААН. Такі прадстаўнічы колькасны склад указвае на важнасць гэтай падзеі для ўсёй сусветнай супольнасці. З якімі прапановамі на саміце выступала Беларусь і ці пачулі нашу пазіцыю па многіх пытаннях прадстаўнікі іншых краін, даведаліся ў парламентарыяў, якія прадстаўлялі беларускую дэлегацыю.

За мір і стваральную працу

Як звяртае ўвагу **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ**, заслугі нашай краіны ў дасягненні Мэт устойлівага развіцця адзначаны кіраўніцтвам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Таксама кіраўніцтвам ААН, сусветнай супольнасцю заўважана тое, што Беларусь — адзіная краіна, у якой нацыянальным каардынатарам па Мэтах устойлівага развіцця з'яўляецца высокапастаўлены парламентарый, віцэ-спікер Савета Рэспублікі (менавіта Валерый Бельскі і ўзначальваў нашу дэлегацыю на саміце). Аднак у сувязі з абстаноўкай у свеце, высокім узроўнем рэўнасці, а часам і палітычнай зайздрасці, па словах сенатара, разлічваць на тое, што ўсе краіны, асабліва несяброўскія, будуць адносіцца да нас аб'ектыўна, немагчыма. «Нам гэта і не трэба, — удакладняе Сяргей Рачкоў. — Мы ведаем сабе цану і працуем не для ацэнкі сусветнай супольнасці, а перш за ўсё для таго, каб жыццё было дастойным у нашай краіне».

На палях Саміта па Мэтах устойлівага развіцця, а таксама пасяджэння Міжпарламенцкага саюза (МПС) па пытаннях ролі парламентаў у рэалізацыі МУР і дзеянняў парламентаў у інтарэсах здароўя намеснік Старшыні Савета Рэспублікі, Нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця Валерый Бельскі і старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рачкоў правялі шэраг найважнейшых сустрэч. Выступаючы перад калегамі-парламентарыямі, сенатары ахарактарызавалі нацыянальны вопыт па барацьбе з пандэміяй, расказалі аб стварэнні надзейнай і празрыстай заканадаўчай базы для рэгулявання механізмаў рэагавання і забеспячэння эфектыўнага прымянення законаў у сферы надзвычайных сітуацый у галіне аховы здароўя, агучылі асноўныя перашкоды ў справе дасягнення Мэт устойлівага развіцця.

— У розных мерапрыемствах, якія праводзіліся пад эгідай Генеральнай Асамблеі ААН, выступалі за адмену санкцый, канстатавалі іх незаконнасць, — адзначае **намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Валерый БЕЛЬСКІ**. — Нельга сказаць, што, калі мы агучылі свае патрабаванні, высновы адносна негатыўнага ўплыву санкцый на дасягненні Мэт устойлівага развіцця, наша пазіцыя была сустрэта з захапленнем. Аднак мы пастаянна канстатуем, звяртаем увагу на гэтае пытанне, паколькі ў такой сітуацыі аб дасягненні пэўных Мэт устойлівага развіцця ў глабальным маштабе размова ісці не можа.

Аднак не ўсё было так гладка, як здаецца на першы погляд. Дэлегатам з Беларусі ў Нью-Ёрку на дыскусіях было праблематычным атрымаць слова. Несяброўскія сілы ўсё ж такі рабілі пэўныя палітычныя намаганні для таго, каб пазбавіць нашых прадстаўнікоў права выступіць на міжнароднай пляцоўцы. Аднак у іх нічога не атрымалася.

— Кіраўнік дэлегацыі давёў да сусветнай супольнасці нашу пазіцыю, — распавядае старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы. — Перш за ўсё па пытаннях, звязаных з забеспячэннем міру. Як сказаў Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, без міру не можа быць развіцця. І сказаў ён нашмат раней, чым потым гэта пачалі паўтараць у Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Гэтую лінію дыскусіі задала менавіта Рэспубліка Беларусь.

Тэмы міру і аднабаковых прымусовых мер гучалі ў выступленнях прадстаўнікоў прыблізна 20 дэлегацый. «У Беларусі ўсё складваецца дастаткова добра, нягледзячы на тое, што нам устаўляюць палкі ў колы, — заўважае Сяргей Рачкоў. — Але мы ўпэўнена трымаем гэты ўдар, дзякуючы той вялізнай рабоце, якая праводзіцца Прэзідэнтам, урадам, парламентам. Беларускі народ — за мір і стваральную працу. Цалкам склалася ўражанне, што гэтая выснова прымаецца да ўвагі прадстаўнікамі краін, у тым ліку несяброўскіх. Беларусь у іх выступленнях амаль не была закранута, хоць тэматыка Украіны падымалася шэрагам дэлегацый. Аднак мы бачым, што і гэтая тэма паступова становіцца больш спакойнай, калі можна так выказацца. Вядома, яе дэлегацыі абмяркоўвалі больш у ходзе агульнакрытычнай дыскусіі, але і тая дыскусія, якая праходзіла на Саміце па МУР, сведчыла: свет усё ж такі пачынае пераглядаць свае падыходы, звязаныя з забеспячэннем міжнароднага міру і бяспекі».

Беларускаму вопыту — высокая ацэнка

На палях саміта адбылося і пасяджэнне Міжпарламенцкага саюза (МПС) па пытаннях ролі парламентаў у рэалізацыі Мэт устойлівага развіцця і дзеянняў парламентаў у інтарэсах здароўя. Кажучы аб парламенцкіх сувязях паміж краінамі — удзельніцамі ААН, Валерый Бельскі адзначае, што, як правіла, пазіцыя парламентарыяў паўтарае пазіцыю кіраўнікоў дзяржаў. «Краіны, якія прызнаюць ідэалогію эканамічнага і палітычнага ціску, спрабуюць зрабіць нас ізгоямі і ў парламенцкай дыскусіі выступаюць негатыўна, — удакладняе ён. — Аснову нашых выступленняў складалі заклікі і аргументацыя аб неабходнасці мірнага існавання і зыходу ад мер палітычнага і эканамічнага ціску. Акрамя гэтага, нам удалося правесці шэраг сустрэч з высокапастаўленымі супрацоўнікамі ААН. Мы абмяркоўвалі праблемы сацыяльнага характару. Перш за ўсё — міграцыйнага крызісу. Мы змаглі данесці сваю пазіцыю і завастрыць увагу на пытаннях абароны правоў бежанцаў».

Нашы парламентарыі прадставілі сусветнай супольнасці і інфармацыю аб падтрымцы некаторымі сумежнымі краінамі арганізацый тэрарыстычнай накіраванасці, якія пагражаюць Рэспубліцы Беларусь правядзеннем тэрарыстычных актаў. Таксама былі разгледжаны пытанні абароны правоў дзяцей. У Беларусі рэалізаваны прагрэсіўныя заканадаўчыя ініцыятывы. Наш вопыт атрымаў вельмі высокую ацэнку міжнароднай супольнасці. Парламентарыі з іншых краін праявілі цікавасць і да беларускага досведу заканатворчасці ў сферы грамадзянскай супольнасці.

На шляху да разважлівасці і павагі

Па вяртанні ў Беларусь парламентарыі ўжо наведалі нацыянальны офіс ААН, дзе паведамілі аб выніках сустрэч у Нью-Ёрку.

«Кіраўніцтва і сакратарыят офіса ААН у Беларусі дастаткова пазітыўна і канструктыўна адрэагавалі на ўсе тыя пытанні, якія мы падымалі ў ходзе сустрэч у ЗША, — канстатуе Сяргей Рачкоў. — Мы ўбачылі зацікаўленасць у рабоце па многіх тэмах. У прыватнасці, сакратарыят ААН рыхтуе даклад, звязаны з уплывам аднабаковых прымусовых мер на выкананне Мэт устойлівага развіцця. Нацыянальнай акадэміяй навук таксама будзе падрыхтаваны даклад па гэтай тэме. Мы прапанавалі яго разгледзець і выкарыстаць пры падрыхтоўцы матэрыялу ААН, што было ўспрынята станоўча».

У цэлым, па словах старшыні Пастаяннай камісіі, у Беларусі ёсць два вельмі моцныя аргументы ў сістэме міжнародных адносін, у тым ліку ў ААН. «Першы пасыл і прапанова Аляксандра Лукашэнкі — правесці глабальны дыялог па пытаннях бяспекі ў духу Сан-Францыска, — нагадвае ён. — І другі (аб гэтым у тым ліку казалі ў ходзе Саміту ААН па МУР) — мы гатовы нарасціць пастаўкі харчавання на сусветныя рынкі: акрамя крызісу ў галіне бяспекі, цяпер назіраецца і сур'ёзны харчовы крызіс. Аднабаковыя прымусовыя меры ўплываюць на нашы магчымасці пастаўкі і забеспячэння ўсяго свету, перш за ўсё краін, якія развіваюцца, прадуктамі харчавання. Гэта вельмі сур'ёзная тэма, якой займаецца асабіста Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый».

Як звяртае ўвагу Валерый Бельскі, наша прадстаўніцтва ў ААН вядзе маніторынг пазіцый у адносінах Рэспублікі Беларусь. «Па выніках Саміту па МУР і Генеральнай Асамблеі прадстаўніцтва канстатуе, што Беларусь у негатыўным кантэксце згадваецца ўсё радзей, — заўважае намеснік Старшыні Савета Рэспублікі. — Хацелася б, каб гэта была ўстойлівая тэндэнцыя, каб ўсё ж такі вярнуліся на трэк разважнасці і павагі нашых інтарэсаў, знялі б тыя праблемы, якія перашкаджаюць дасягненню Мэт устойлівага развіцця».

Безумоўна, пазіцыю Беларусі па розных пытаннях чуюць. Іншая справа — ці прыслухоўваюцца? «Падзеі вакол нашай краіны пацвярджаюць, што мы ідзём сваёй дарогай, маем сваю пазіцыю, якая многімі краінамі падзяляецца, — рэзюмуе Сяргей Рачкоў. — Але ёсць і праціўнікі гэтай пазіцыі, з якімі нам трэба працаваць. І мы працуем, перш за ўсё выкарыстоўваючы для гэтага міжнародныя пляцоўкі. Не кожная з краін гатова сёння выкарыстоўваць дыпламатычныя метады, а дыпламатыя — гэта перш за ўсё дыялог, сустрэча за сталом перагавораў і абмеркаванне тых пытанняў, якія хвалююць абодва бакі».

Вераніка КАНЮТА.

НЕ ПРОСТА ІНФАРМАЦЫЙНЫ ШУМ

Як эфектыўна працаваць з людзьмі, абмеркавалі ў Пухавіцкім раёне

Фота БелТА.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА ў час рабочай паездкі ў Пухавіцкі раён Мінскай вобласці прыняў удзел у пасяджэнні райвыканкама. Разглядалася пытанне аб выніках работы па выкананні Дырэктывы Прэзідэнта «Аб дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату і павышэнні якасці забеспячэння жыццядзейнасці насельніцтва» за першае паўгоддзе.

«У рабоце са зваротамі грамадзян самае галоўнае — не стаць абыякавымі, як кажуць у народзе, і не зачарсцвець да праблем простага чалавека, таму што праблемы будуць збірацца і збірацца. Я думаю, што гэта самая вялікая небяспека для ўсіх нас», — лічыць Ігар Сергеенка.

Разам з тым, адзначыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта, не варта дапускаць і ўтрыманства. «Вырашаючы сур'ёзныя праблемы, мы часам, дзе трэба і не трэба, балуем грамадзян. І з'яўляецца праблема ўтрыманства. Таму трэба вылучаць больш сур'ёзныя праблемы, для вырашэння якіх сапраўды патрэбна дапамога дзяржавы», — падкрэсліў ён.

Ігар Сергеенка звярнуў увагу і на пытанне дэбюракратызацыі. «Не трэба ўсё зводзіць да разгляду зваротаў грамадзян. Дырэктыва № 2 усё ж такі крыху шырэйшая. Калі праблема ёсць, яе трэба агучваць, абмяркоўваць, нешта прапаноўваць для вырашэння», — сказаў на заканчэнне кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Ён закрануў і пытанне інфармацыйнай работы з грамадзянамі. «Інфармацыйная работа не павінна быць проста інфармацыйным шумам. Можна стварыць шмат выязных груп, ахапіць шырокія пласты насельніцтва, а ў выніку правесці ўсё гэта фармальна і бяздушна. Калі мы праводзім такія мерапрыемствы, людзі туды павінны ісці з цікавасцю», — падкрэсліў Ігар Сергеенка.

Паводле БелТА.

Выбары-2024

Па новых правілах

Цэнтрвыбаркам сфарміраваў акругі і ўстанавіў сярэднюю колькасць выбаршчыкаў на выбарчую акругу па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу восьмага склікання

Усяго ў краіне будзе сфарміравана 1284 Саветы дэпутатаў. Сярэдняя колькасць выбаршчыкаў на выбарчую акругу складзе 61 960 чалавек. Як паведаміў старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігар КАРПЕНКА, аналагічныя рашэнні прыняты на месцах, вызначана таксама колькасць акруг, якія будуць утварацца да выбараў дэпутатаў мясцовых саветаў. «Гэта лічба складзе 12 514 акруг, што на 5,5 тысячы менш у параўнанні з кампаніяй 2018 года, — дадаў ён падчас пасяджэння ЦВК. — Колькасць саветаў зменшылася на 25».

Пастанова Цэнтрвыбаркама змяшчае падрабязнае апісанне межаў кожнай акругі, а таксама яе найменне, нумар, колькасць выбаршчыкаў і месца знаходжання акруговых выбарчых камісій. Дакумент будзе апублікаваны на афіцыйным сайце Цэнтральнай камісіі — www.rec.gov.by, а таксама ў друкаваных сродках масавай інфармацыі. Праведзена работа па нанясенні межаў выбарчых акруг на публічную кадастравую карту Рэспублікі Беларусь.

Абноўлены сайт і падарунак для маладых выбаршчыкаў

Ажыццяўляецца поўная мадэрнізацыя сайта Цэнтральнай выбарчай камісіі, адпрацоўваюцца пытанні павышэння яго прапускной магчымасці. «Мы бачым, што на сайты дзяржорганаў нярэдка ідуць знешнія атакі, здольныя непадрыхтаваны сайт «пакласці», — патлумачыў Ігар Карпенка прычыну гэтай работы. — Цудоўна разумеем, што ўсе месенджары, якія ў нас ёсць у сацыяльных сетках, могуць быць адключаныя, заблакіраваныя для нас і г. д. Таму будзем арыентаваць усіх на тое, што першая і самая дакладная інфармацыя Цэнтральнай выбарчай камісіі будзе размяшчацца на сайце ЦВК».

Маладым выбаршчыкам, якія ўпершыню прыйдуць на выбарчыя ўчасткі ў адзіны дзень галасавання, будуць уручаны падарункавыя выданні Канстытуцыі. Такое рашэнне было прынята на пасяджэнні ЦВК. Усяго будзе выпушчана каля 180 тысяч падарункавых выданняў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь на рускай і беларускай мовах. Маладым людзям, якія ўпершыню прагаласуюць на выбарчых участках, падарункавае выданне ўручаць як у адзіны дзень галасавання, так і ў перыяд датэрміновага галасавання. Як удакладнілі ў ЦВК, да тых, хто галасуе ўпершыню, будуць адносіцца грамадзяне, якія дасягнулі ўзросту 18 гадоў у перыяд з 28 лютага 2022 года да 25 лютага 2024 года ўключна.

Выбарчыя ўчасткі за мяжой фарміравацца не будуць

У размове з журналістамі старшыня ЦВК Ігар Карпенка расказаў аб запрашэнні замежных назіральнікаў на адзіны дзень галасавання. «Гэтае пытанне прапрацоўваецца тымі суб'ектамі, хто можа запрашаць замежных назіральнікаў, — адзначыў ён. — Акрамя ЦВК, такім правам валодаюць Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, абедзве палаты парламента, Савет Міністраў і МЗС. Але пакуль казаць аб запрашэнні, прынамсі афіцыйным, рана, бо трэба дачакацца выхаду ўказа кіраўніка дзяржавы ў сярэдзіне лістапада, які акрэсліць пачатак выбарчай кампаніі. З моманту з'яўлення ўказа пачнецца вылучэнне ў склады камісій — тэрытарыяльных, акруговых, участковых. Пачнецца збор подпісаў, рэгістрацыя груп, вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты». Ігар Карпенка расказаў, што на пасяджэнні Кансультатыўнага савета, які праходзіў ва Узбекістане ў перыяд прэзідэнцкіх выбараў у гэтай краіне, ён запрасіў сваіх калег — старшыняў ЦВК краін СНД, якія ўваходзяць у Кансультатыўны савет выбарчых органаў краін СНД, — прыехаць і прыняць удзел у назіранні за адзіным днём галасавання.

Па меркаванні старшыні Цэнтрвыбаркама, рашэнне аб тым, што на выбарах не будуць фарміравацца выбарчыя ўчасткі за мяжой, не ўшчамляе правы грамадзян. Той, хто выехаў за мяжу па тых ці іншых прычынах, зможа прыехаць у Беларусь, прыйсці на ўчастак і прагаласаваць або ў перыяд датэрміновага галасавання з аўторка да суботы, або ў адзіны дзень галасавання — 25 лютага 2024 года.

Ігар Карпенка ўдакладніў: для таго каб прагаласаваць, патрэбны дакумент, які пацвярджае асобу. «Такім з'яўляецца пашпарт, але ЦВК традыцыйна прымае рашэнне аб тым, якія яшчэ дакументы могуць сведчыць асобу грамадзяніна, — заўважыў ён. — У выпадках, калі пашпарт, дапусцім, знаходзіцца на афармленні, пададзены на атрыманне візы і г. д. Да такіх дакументаў мы, як правіла, адносілі вадзіцельскае пасведчанне, пенсіённае пасведчанне, студэнцкі білет і іншыя. Гэта чыста працэдурныя пытанні».

Паводле БелТА.

На свае вочы

«ГЭТА НАЙЛЕПШЫ ПАДАРУНАК»

Сімвал Незалежнасці зноў адчыніў свае дзверы для гасцей

110 інспектараў і спецыялістаў Мінскай рэгіянальнай мытні і 115 заслужаных работнікаў сістэмы Мінлясгаса з усіх куткоў Беларусі ўчора з экскурсіяй наведалі Палац Незалежнасці. Такія экскурсіі сталі ўжо добрай традыцыяй. Яны заўсёды праходзяць у цёплай атмасферы, і эмоцыі проста зашкальваюць ад убачанага і пачутага тут.

Вядучы спецыяліст па вучэбнай частцы цэнтра павышэння кваліфікацыі работнікаў лясной гаспадаркі Алена ПАЎКОЛАС з агарадка Ляхновічы ў Палацы Незалежнасці сустрэла свой дзень нараджэння: «Я марыла трапіць сюды ўжо вельмі даўно. Рада, што такая ўрачыстая і хвалюючая падзея адбылася менавіта ў гэты дзень. Тут, як і належыць сапраўднаму палацу, вельмі прыгожа і парадна! Уражанні і эмоцыі проста зашкальваюць. У першую чаргу абавязкова распавяду пра палац сваёй сям'і, сябрам, блізкім і ў сацыяльных сетках абавязкова падзялюся».

Суразмоўца прызнаецца, што наведаць Палац Незалежнасці ў такі знакавы для яе дзень не чакала. Па яе словах, такая магчымасць — найлепшы падарунак.

Традыцыйна экскурсія пачынаецца з самай вялікай залы ўрачыстых цырымоній, дзе праходзіць мноства важных мерапрыемстваў. Пераходзячы з залы ў залу, наведвальнікі не стамляюцца захапляцца дзівосным убраннем. Усё гэта дзякуючы таленту нашых суайчыннікаў. Пышныя люстры, эксклюзіўная мэбля, карціны, мазаіка з паркету і мноства выдатных дэталяў стварыць асаблівую атмасферу ў кожнай зале. Дарэчы, усяго ў палацы 20 асноўных залаў, дзе праходзяць найважнейшыя мерапрыемствы.

Памочнік ляснічага Навагрудскага ляснічства Святлана ШОРАХ і **ляснічы Навагрудскага ляснічства Дзмітрый ШЫНТАР** пяць дзён таму звязалі свае жыцці законным шлюбам. Як адзначаюць маладыя, наведаць Палац Незалежнасці — шыкоўны падарунак: «Мы марылі сюды прыехаць, бо чулі пра маштабы і прыгажосць Палаца Незалежнасці. Нам выпаў вялікі гонар трапіць сюды, і мы з радасцю паехалі. Тут вельмі прыгожа. Лічым, што кожнаму трэба тут пабываць. Адчуваецца нацыянальны гонар за Радзіму, а нацыянальная сімволіка зачароўвае.

Палац Незалежнасці сапраўды стаў месцам гонару беларусаў. Яго пабудавалі за 30 месяцаў замест 58 запланаваных, і ён на 90 % выкананы беларускімі майстрамі з айчынных матэрыялаў. Што характэрна, у афармленні багата выкарыстоўваецца нацыянальны арнамент — у мастацкім роспісе сцен, столяў, у мазаіцы і метале. Першых высокіх гасцей палац прыняў у кастрычніку 2013 года, амаль 10 гадоў таму.

Станочнік дрэваапрацоўчага цэха Расонскага лясгаса Віктар КАМКОЎ адпрацаваў у родным лясгасе 35 гадоў. Ён таксама падзяліўся ўражаннямі: «Для мяне наведванне Палаца Незалежнасці стала нечаканасцю. Першыя ўражанні яркія. Вельмі рады, што мне выпаў такі гонар. Прыгажосць, маштаб, архітэктура — я ніколі такога яшчэ не бачыў».

Не скупіцца на эмоцыі і наступны суразмоўца, **ляснік Чэрыкаўскага лясгаса Васіль ПСЕЎКІН**: «У лясной гаспадаркі працую ўжо 33 гады. На мінулым тыдні, у Дзень работнікаў лясной гаспадаркі, наведаў Мінск і атрымаў узнагароду ад міністра. А ўжо сёння я ў Палацы Незалежнасці! Ніколі раней тут не быў, і вось мне пашанцавала ўбачыць на свае вочы. Вельмі прыгожа. Усе пакоі і залы, якія мы паглядзелі, захапляюць. Лічу, што абсалютна кожнаму варта тут пабываць».

Безумоўна, наведванне Палаца Незалежнасці застанецца незабыўнай падзеяй, якая падарыла магчымасць яшчэ раз адчуць гонар за родную Беларусь, за сваіх таленавітых суайчыннікаў.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ, фота аўтара.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

IT-кампаніі звольнілі звыш 236 тысяч супрацоўнікаў

Звыш 236 тысяч работнікаў тэхналагічнай сферы ў свеце пазбавіліся работы з пачатку гэтага года, паказвае даследаванне партала Layoffs.fyi. Даныя сведчаць аб тым, што колькасць скарачэнняў у тэхсектары сёлета значна перавысіць паказчык за мінулы год. Летась кампаніі звольнілі 154,3 тысячы супрацоўнікаў, паведамляе Layoffs.fyi. На мінулым тыдні вытворца тэлекамунікацыйнага абсталявання Cisco Systems Inc. анансаваў звальненне 350 супрацоўнікаў, а ў пачатку верасня аб скарачэнні штата на 10 працэнтаў абвясціла стрымінгавая кампанія Roku Inc. Яе штат на канец мінулага года налічваў каля 3,6 тысячы чалавек. Сярод тэхкампаній, якія абвясцілі аб звальненнях у гэтым годзе, — амерыканскія Amazon.com Inc., Electronic Arts, Palantir Technologies, Twilio Inc., DocuSign Inc., Salesforce Inc., Zoom Video Communications, eBay, Dell Technologies, PayPal Holdings, International Business Machines, Intel Corp., Microsoft Corp., Alphabet Inc., а таксама нямецкая SAP і шведская Spotify Technology.

Колькасць загінулых і пацярпелых пры пажары на вяселлі ў Іраку перавысіла 450 чалавек

Пра гэта паведаміла мясцовая арганізацыя Чырвонага Паўмесяца ў сацсетках. Жудасны інцыдэнт адбыўся ў зале вясельных урачыстасцяў у горадзе Бахдыда (таксама вядомым як Эль-Хамданія або Каракош), што ў правінцыі Найнава. З'явіліся кадры ўзгарання і яго наступстваў. Відаць, што цалкам выгарэла зала, дзе праходзіла вяселле, абрынуліся сцены і дах, а ад мэблі застаўся толькі каркас. Паводле папярэдніх даных, прычынай узгарання стала выкарыстанне феерверку ў закрытым памяшканні. Па інфармацыі ўпраўлення грамадзянскай абароны, урачыстая зала была абсталявана лёгкаўзгаральнымі панэлямі, што парушала правілы тэхнікі бяспекі. Таксама былі выяўлены парушэнні ў сістэмах сігналізацыі і тушэння пажараў, якія не адпавядаюць стандартам бяспекі.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста ў сувязі з пажарам у горадзе Эль-Хамданія накіраваў спачуванне Прэзідэнту Ірака Абдуле Латыфу Рашыду.

«ЛЮДЗІ ЧАКАЮЦЬ»

АГУЛЬНАЕ РАШЭННЕ

Увогуле, у зоне адказнасці Жанны Мікалаеўны — населеныя пункты пяці раёнаў Гомельшчыны: Хойніцкага, Брагінскага, Нараўлянскага, Лоеўскага і 15 сельсаветаў Рэчыцкага. У цэлым у выбарчай акрузе дэпутата Палаты прадстаўнікоў пражывае каля 58 тысяч чалавек. Свой насычаны працоўны графік Жанна Мікалаеўна выбудоўвае такім чынам, каб раз на два месяцы абавязкова ахапіць работай населеныя пункты кожнага раёна.

Абавязковым радком у раскладзе дэпутата заўсёды стаяць асабістыя прыёмы грамадзян, прамыя тэлефонныя лініі, выязныя сустрэчы.

— Значная частка пытанняў, з якімі звяртаюцца людзі, звязана з праблемамі добраўпарадкавання, датычыцца сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, — расказвае яна. — Але адзначу, што апошнім часам 25—30 % пытанняў, якія паступаюць да мяне ад выбаршчыкаў, датычацца законапраектаў, інфармацыйнай, юрыдычнай дапамогі. Часта людзі не ведаюць, да якіх органаў улады ці ў якую дзяржаўстанову варта звярнуцца, каб вырашыць сваё праблемнае пытанне.

Гэтым разам падчас правядзення прыёму грамадзян і прамой тэлефоннай лініі ў Хойніках да парламентарыя зноў паступілі самыя розныя просьбы аб дапамозе. Так, пажылая пара з райцэнтра чакае рамонту ліхтара вуліч-

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На асабістым прыёме грамадзян дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Жанна ЧАРНЯЎСКАЯ і намеснік старшыні Хойніцкага райвыканкама Анатоль ГУРА.

нага асвятлення каля іх дома. З аграгарадка Вялікі Бор паступіў зварот на падтапленні падвала ў шматкватэрным доме. Як высветлілася, сеткі каналізацыі ў доме патрабуюць рамонту, матэрыялы для яго ўжо закуплены і прывезены, але работы камунальнікі на момант звароту не пачынялі. Цяпер жыхары дома якраз купляюць на зіму сезонную агародніну, спускаюць прыпасы ў падвал, таму, зразумела, хвалююцца, ці не наробяць бяды зношаныя трубы.

Таксама на асабісты прыём да парламентарыя паступіў зварот аб добраўпарадкаванні ў райцэнтры паніжаных бардзюраў для з'ездаў веласіпедыстаў. Гэта неабходная ўмова ў тым ліку безбар'ернага асяроддзя. Агучаная праблема, як пераканала дэпутат, будзе абавязкова прапрацавана з райвыканкамам і раённай камунальнай арганізацыяй.

— Аператыўна знаходзіць агульныя рашэнні падчас звароту грамадзян дапамагае тое, што на прыём і прамую тэлефонную лінію абавязкова запрашаю намесніка старшыні райвыканкама, спецыялістаў адказных службаў. Мы адразу абгаворваем, колькі часу трэба для вырашэння таго ці іншага пытання, — адзначае Жанна Чарняўская.

ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ

Дарэчы, пакуль парламентарый вядзе прыём, на тэлефон атрымлівае паведамленні аб станоўчым вырашэнні звароту, узятых на кантроль раней.

— Звярнулася жыхарка раёна — інвалід першай групы. Жанчына па стане здароўя з цяжкасцю перамяшчаецца нават па доме. Папрасіла дапамагчы з афармленнем для яе сядзелкі. Вядома, па законе чалавек, які будзе аказваць паслугі па надомным догляду, павінен прайсці пэўную працэдуру, у тым ліку сабраць пералік дакументаў, — тлумачыць Жанна Мікалаеўна.

Дэпутат звязалася са структурамі Хойніцкай цэнтральнай райбальніцы, тэрытарыяльным цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, упраўленнем па працы, занятасці і сацыяльнай абароне райвыканкама. Калі ўзнялі ўсе дакументы, высветлілі, што заяўніца па яе захворваннях мае права на догляд сядзелкі. Цяпер пытанне цалкам урэгулявана, і парламентарый якраз аб гэтым атрымала паведамленне на мабільны. Увогуле, зазначае Жанна Мікалаеўна, для яе вельмі важная абавязковая зваротная сувязь па кожным звароце ад людзей, якія да яе паступаюць.

Падчас работы ў раёне дэпутат Палаты прадстаўнікоў абавязкова трымае на кантролі і звароты, якія па тых ці іншых прычынах пакуль не ўдалося вырашыць канчаткова.

— Цяпер прапрацавала пытанне, якое трымаю на кантролі. Так, сям'я з Хойніцкага раёна хоча выкупіць дом, які па судзе прызнаны пустым. Перад выстаўленнем будынка на аўкцыён ідзе працэс яго дзяржаўнай ацэнкі. Але заяўнікі хвалююцца, каб працэс не зацягнуўся. Яшчэ раз абмеркавалі гэтае пытанне са спецыялістамі і запэўнілі сям'ю, што на працягу двух тыдняў павінна быць прынята рашэнне аб ацэнцы дома, і тады нерухомасць будзе выстаўлена на аўкцыён. Дарэчы, ёсць дамоўленасць, што, нават калі кошт дома будзе перавышаць суму, якую гэтыя людзі змогуць унесці, райвыканкам гатовы даць ім растэрміноўку плацяжу, — звяртае ўвагу Жанна Чарняўская.

Між тым дэпутат разам з раённымі ўладамі з выездам на месца адпрацоўвае звароты, якія доўгі час не вырашаліся. Так, на дрэнны стан дарог скардзіліся жыхары вуліц Чапаева і Камарова ў Хойніках. Першая была шмат гадоў таму заасфальтавана, але пакрыццё прыйшло ў непрыдатнасць. Грунтавую ж вуліцу Камарова моцна разбілі. Цяпер на ёй правялі належную падсыпку.

ВЫКАНАЦЬ ПЕРАДВЫБАРНЫЯ АБЯЦАННІ

Чакалі асабістай сустрэчы з парламентарыем гэтым разам і жыхары Паселіцкага сельсавета. Пасля аварыі на ЧАЭС мясцовыя населеныя пункты не былі газіфікаваны. Паступала шмат звароткаў ад людзей, праводзіліся сустрэчы з жыхарамі, у якіх у тым ліку прымала ўдзел парламентарый. Работы па газіфікацыі вёсак пачаліся яшчэ ў 2021 годзе. Сумеснымі намаганнямі ўдалося гэта пытанне зрушыць з месца.

— У сельсаветах сустракаюся з людзьмі не толькі на сельскіх сходах — праводжу сустрэчы з калектывамі мясцовых прадпрыемстваў і арганізацый, дэпутатамі, раблю маніторынг цэн на тавары і лекі. Увогуле, пастаянна застаюся на сувязі з усімі сваімі раёнамі. Для вырашэння складаных пытанняў фармулюю дэпутацкі запыт: зварот у тое ці іншае міністэрства ці ведамства па тлумачэнне хвалюючага пытання, — адзначае сурасмоўніца.

Між тым у графік работы парламентарыя ў Хойніках цяпер было ўключана наведванне і вядомага на Гомельшчыне прадпрыемства, якое вырабляе спецадзенне для работы пры самых высокіх тэмпературах, — таварыства з абмежаванай адказнасцю «Спецславія».

— Калі балатавалася ў дэпутаты, у сваёй выбарчай праграме абазначыла садзейнічанне развіццю малога і сярэдняга бізнесу раёнаў. Ініцыятывамі і праектамі займалася яшчэ да абрання, таму мне было вельмі важна і цікава працягваць гэту тэму. Улічваючы, што ў Саюзнай дзяржаве Беларусі і Расіі выпрацавана 28 саюзных праграм, эканомікі нашых краін вельмі актыўна збліжаюцца, у мінулым годзе я ініцыявала прыезд дэлегацыі прадстаўнікоў бізнесу з расійскіх рэгіёнаў у пяць раёнаў сваёй выбарчай акругі. Хацелася паказаць, які ёсць патэнцыял у нашых прадпрыемстваў, — звяртае ўвагу Жанна Мікалаеўна.

Пасля наведвання Хойніцкага раёна прадстаўнікі расійскага бізнесу прапанавалі прадпрыемству «Спецславія» заключыць новыя вялікія кантракты, у тым ліку на выраб экіпіроўкі для службаў МНС, а таксама Узброеных Сіл.

— Для мяне было важна пабачыць на свае вочы, як працуюць людзі на прадпрыемстве, як цяпер развіваецца вытворчасць, — падзяліліся дэпутат. — Прадпрыемства ўзяло ў арэнду новае памяшканне, украпаненае і свае новыя напрацоўкі. Вельмі важна і тое, што работнікі адчуваюць падтрымку кіраўніцтва: адкрываюцца новыя працоўныя месцы. З пачатку года дадаткова працаўладкавалі 40 чалавек і яшчэ дзесяць — да канца года. У выніку будзе забяспечана работай 100 чалавек, што вельмі важна для раёна.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Скарбонка дабрабыту

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Калі вы здымаеце грошы датэрмінова, то працэнты налічваюцца і выплачваюцца за фактычны час захоўвання сродкаў па стаўцы, ніжэйшай за асноўную. Цяпер умовы датэрміновага скасавання вельмі жорсткія. Бываюць выпадкі, калі ваш дэпазіт на пяць месяцаў, а грошы вы забралі ўжо праз месяц. У гэтым выпадку вам налічаць усяго ад 0,1 да 1 працэнта даходу.

Безадзыўныя ўклады, наадварот, чакаюць свайго часу. Вы ўносіце грошы на дэпазіт і забіраеце іх толькі пасля заканчэння таго тэрміну, які ўказаны ў дагаворы. Сітуацыі бываюць розныя, і ў форс-мажорных абставінах банк можа пайсці вам насустрач і датэрмінова вярнуць грошы, але для гэтага патрэбныя важкія падставы. Стаўкі па безадзыўных дэпазітах заўсёды прывабныя і вышэйшыя.

ЯКІЯ ЁСЦЬ ВАРЫЯНТЫ?

Дастаткова жорсткія ўмовы ва ўкладу ў аднаго з банкаў «Прыбытковы плюс». Гэтым разам маецца магчымасць адкрыцця дэпазіту непасрэдна ў аддзяленні. Уклад безадзыўны, пераменная працэнтная стаўка і выплата працэнтаў у канцы тэрміну. Тэрмін захоўвання — 13 месяцаў, а гадавая працэнтная стаўка — 12 %. Што характэрна, папаўненне ўкладу, любыя расходныя аперацыі і аўтаматычнае перазаключэнне не прадугледжаны. Прыйшоў, паклаў грошы, потым праз 13 месяцаў забраў. Іншага не дадзена.

Таксама 12 % гадавых даюць і іншыя несістэмныя банкі краіны. Там дэпазіты адкрываюцца на 14 месяцаў і больш, а першапачатковая сума — не менш за 500 рублёў.

Але самыя прывабныя ўмовы ў аднаго з банкаў. Там ёсць безадзыўны ўклад, з тэрмінам размяшчэння грошай ад 13 да 37 месяцаў. Працэнтную стаўку абяцаюць ад 12,5 % да 12,9 % гадавых. У дадзеным банку абяцаюць фіксаваную стаўку, штомесячную выплату працэнтаў і зняцце капіталізаваных працэнтаў.

Сярэднявыгадны, а галоўнае, бяспечны адзін з укладаў, які афармляецца дыстанцыйна, не наведваючы банка. Самыя максімальныя працэнтныя стаўкі на 2 і 3 гады — 11,3 % гадавых. Працэнтная стаўка з'яўляецца фіксаванай толькі першыя 3 месяцы, з чацвёртага месяца аўтаматычна пераводзіцца ў разрад зменных. Так, гэта гнуткая стаўка, але змяняецца яна не па жаданні банкаўскіх работнікаў. Дарэчы, потым гэтая стаўка можа нават павялічвацца.

ВАЛЮТА І АБЛІГАЦЫІ

Працэнты па валютным укладзе невялікія — максімум 1,1 % гадавых. Сярэдняя стаўка па доўгатэрміновых укладах складае ад 0,4 % да 1 %.

Што датычыцца падаткаў, то з рублём мы маем паслабленне. Падаходны падатак (13 %) будзе ўтрымлівацца з даходаў, атрыманых у беларускіх рублях, тэрмінам менш за адзін год. Паляжалі вашы кроўныя рублі на рахунках год і адзін дзень — усё, ніякіх падаткаў з працэнтаў плаціць не трэба. А з замежнай валютай усё складаней. Падатак прыдзецца плаціць абавязкова, калі такія грошы пралежалі ў банку менш за два гады.

Укладваць свае грошы ў куплю каштоўных папер рызыкне не кожны.

Цяпер у нашай краіне наладжана рэалізацыя карпаратыўных аблігацый. У адным з банкаў створана спецыяльнае прадпрыемства, якое гэтым займаецца. Прадаецца мноства аблігацый розных прадпрыемстваў і фінансавых кампаній. Гэта і добра вядомыя фірмы, і структуры, якія былі створаны нядаўна. Доларавая прыбытковасць гэтых каштоўных папер вар'іруецца ад 6 % гадавых да 9 %.

Дарэчы, не так даўно Мінфін нашай краіны запусціў у вольны продаж аблігацыі, якія намінаваныя ў кітайскіх юанях. Даходнасць у іх невялікая, усяго 3,8 % гадавых. Але тут трэба ўлічваць, што курс юаня пастаянна расце. Акрамя таго, забеспячэннем гэтых аблігацый з'яўляецца рэспубліканскі бюджэт. Ёсць там аблігацыі і ў беларускіх рублях. Дык вось, максімальная стаўка даходнасці аблігацый у айчыннай валюце роўная 25 % гадавых. Браць?

ЗБЕРАЖЭННІ ТРЭБА ЎМЕЦЬ ЭКАНОМІЦЬ

Важнае правіла, якое мы з жонкай стараемся выконваць, — гэта паход у краму са спісам. Калі выразна вызначаеш, якія прадукты неабходныя, менш шанцаў патрацціцца на няважныя тавары.

Яшчэ невытлумачальны момант — грошы на банкаўскай картцы трацяцца хутчэй, чым наяўныя. Таму мы з жонкай пакідаем на ёй цяпер невялікія сумы. Так прасцей сачыць за сямейным бюджэтам, каб не патраціць выпадкова лішняе.

Крэдыты — гэта фінансавая залежнасць, ад якой лепш пазбавіцца. На першы погляд можа здацца, што яны ратуюць бюджэт ад непрадбачаных сітуацый або пакупак, якія неабходна здзейсніць тут і зараз. Але, калі чалавек бярэ крэдыт, ён заганяе сябе ў яшчэ большае безграшоўе. Крэдыт — гэта ілюзія таго, што ёсць фінансавыя сродкі.

Падаткі плаціць трэба абавязкова. І хачу нагадаць, што ў нас у краіне ёсць падатковыя льготы і вылікі, пра якія многія проста не ведаюць, а таму і не карыстаюцца ўсімі магчымасцямі. Напрыклад, чалавек узяў крэдыт на набыццё кватэры.

У некаторых грамадзян ёсць права скарыстацца падатковым вылікам у памеры 13 % ад сумы ўнесеных грашовых сродкаў на пагашэнне крэдыту на кватэру, якія можна вярнуць, падаўшы пэўны пакет дакументаў па месцы працы. Таксама і з іншымі падатковымі льготамі, якія маюць некаторыя асобныя катэгорыі грамадзян: шматдзетныя сем'і, інваліды і іншыя. Важна ведаць пра ўсе магчымасці. Такая эканомія сродкаў дапаможа накіраваць грошы на нешта важнае.

Інвестыцыі ў здароўе — эканомія. Здавалася б, інвестыцыі і эканомія — зусім пра розныя рэчы. Але не гэтым разам. Лекі і лячэнне каштуюць досыць дорага. Калі не клапаціцца пра сваё здароўе і самаадчуванне, то ў адзін цудоўны дзень гэта можа выліцца ў нешта сур'ёзнае. Тады на лячэнне сыдуць вялікія грошы, а магчымасці зарабляць проста не будзе. У дадзенай сітуацыі інвестыцыі ва ўласнае здароўе дапамогуць сэканоміць будучыя сродкі.

І яшчэ. Не рабіце пакупкі ў дзень зарплаты. На думку многіх псіхолагаў, менавіта ў гэты перыяд грошы трацяцца хутка і лёгка, бо здаецца, што іх досыць шмат. Многія чакаюць дня, калі прыйдзе заробак, і толькі тады ідуць па пакупкі. А варта было б іх рабіць па меры неабходнасці. Такім чынам вы не купіце непатрэбныя рэчы. У канцы месяца многія застаюцца з невялікай колькасцю грошай і зноў пачынаюць чакаць запаветнага дня, калі фінансы паступяць на картку.

Часцяком буйныя пакупкі патрабуюць вялікай колькасці грашовых сродкаў, якія не заўсёды ёсць у адкладзенай суме. Такія пакупкі варта планаваць загадзя. Неабходна разбіць увесь кошт на пэўную колькасць месяцаў (у залежнасці ад вашых магчымасцяў) і адкладаць патрэбную суму. Замест гэтага многія звяртаюцца да крэдытаў. Аднак яны дакладна не пра эканомію.

Але ёсць і непрадбачаныя пакупкі, напрыклад, зламаўся халадзільнік, які рамонту не падлягае. Для форс-мажораў павінна быць сума ў рэзерве, якую неабходна загадзя адкладаць.

Сяргей КУРКАЧ.

НАЙЛЕПШЫ ЧАС — ЦЯПЕР

Амаль у кожнай вёсцы ёсць свой дзівак. Валерый з іх ліку. Гэтаму надзвычай энергічнаму мужчыну — 68 гадоў. Больш за ўсё на свеце ён любіць гісторыю і пра нашы замкі, цэрквы ды касцёлы, здаецца, можа расказваць бясконца. У сезон вандруе па Беларусі на ровары, намотваючы сотні кіламетраў за дзень. Ужо на пенсіі, ён задумаў пабудаваць сабе дом з каменю, які яго суседзі называюць мясцовай славутасцю, вясковым замкам. Каб узвесці яго, Валерый тры гады, як ён сам кажа, ачышчаў калгасныя палі ад камянёў. Вазіў іх на тачанцы, якую прывязваў да свайго жалезнага двухколавага каня. Будаваў «сваю крэпасць», у якой нават печка выкладзена з каменю, практычна адзін. У 2025 годзе плануе заехаць туды жыць. Хтосьці скажа: вунь што задумаў — у 68 гадоў будаваць дом, ды яшчэ з каменю, сапраўды, дзівак. А я шчыра захапляюся такім дзівацтвам і смеласцю крочыць да сваёй мары, не азіраючыся на ўзрост і на тое, хто і што падумае.

Мы ездзілі на экскурсію да Валерыя ўсёй сям'ёй. Пасля паездкі муж даслаў мне ролік пра кітайца Ван Дэшуня. У 44 гады ён толькі пачаў вывучаць англійскую мову, у 49 стварыў сваю групу пантамімы, у 50 упершыню пайшоў у фітнес-залу, у 57 запусціў перформанс «жывая скульптура», у 65 навучыўся ездзіць вярхом на кані, у 78 — кіраваць матацыклам, у 79 выйшаў на подыум, у 81 стаў паслом вядомай кампаніі па вытворчасці спартыўнага адзення і абутку. А ў 85 атрымаў ліцэнзію пілота, тым самым рэалізаваўшы яшчэ адну сваю даўнюю мару. Цяпер Ван Дэшуню 87. І ён ужо паставіў перад сабой чарговую мэту — скокнуць з парашутам. Бо лічыць, што нельга адкладваць важнае на нявызначанае потым. Ёсць рэчы, якія трэба паспець, бо без іх наша жыццё будзе няпоўным. І найлепшы для гэтага час — цяпер, бо хто ведае, што будзе заўтра. На пытанне, як яму ўдалося захаваць такі юнацкі запал, мужчына адказаў: «Прырода вызначае ўзрост, але менавіта вы вызначаеце свой душэўны стан. Вакол столькі магчымасцяў! Калі вы, гледзячы на лічбы ў пашпарце, кажаце, што ўжо вельмі позна, падумайце, можа, гэта толькі апраўданне, каб здацца. Ніхто не здольны спыніць чалавека на шляху да сваёй мары, акрамя яго самога».

«Бог разлічвае, якой даўжыні будзе тваё жыццё, — сказаў у адным са сваіх інтэрв'ю акцёр Аляксандр Абдулаў. — А вось якой шырыні — гэта залежыць ад цябе».

Ведаю некалькі жанчын-беларусак, якія прыйшлі ў мадэльную школу пасля выхаду на пенсію. Святлана адна з іх. У свае 61 яна ходзіць па подыуме, здымаецца ў кліпах і рэкламных роліках, выкладае дэфіле. Падчас сваіх заняткаў яна можа і па сем гадзін хадзіць на абцасах.

Калі я чарговы раз пачынаю скардзіцца на стомленасць і страту цікавасці да жыцця, каб не захрасаць надоўга ў гэтым стане, натхняюся падобнымі пазітыўнымі гісторыямі. А нядаўна адкрыла для сябе цудоўны фільм італьянскага рэжысёра Паола Сарэнціна «Вялікая прыгажосць». Галоўны герой, пісьменнік і журналіст Джэп Гамбардэла, кажа, што толькі праз некалькі дзён пасля таго, як яму споўнілася 65, зразумеў адну важную рэч: «Я не магу больш страчваць час, робячы тое, што не хачу рабіць». І нарэшце дазволіў сабе гэта.

А што датычыцца меркавання іншых... Пра гэта ёсць цудоўная прытча. Бацька з сынам селі на асла і паехалі па найбліжэйшых вёсках. У першай іх аблаялі за тое, што яны ўдвух едуць на жывёліне, не шкадуючы яе. Тата злез з асла. Але ў другой вёсцы насварыліся на сына за тое, што той не шануе бацьку, які вымушаны ісці пешкі. Далей на асла сеў толькі тата, і што вы думаеце? У трэцяй вёсцы ўжо аблаялі яго — за бяздушнасць у адносінах да юнага сына. Пасля гэтага яны высеклі ў лесе жэрдку, звязалі асла і панеслі яго на сабе. У чарговай вёсцы іх дакаралі за ссечанае дрэва і глупства — бо асла ж можна было і дома пакінуць. Пасля яны ўзялі асла на аброць, але іх абазвалі дурнямі, бо асёл ідзе марна і без справы. У выніку тата сказаў сыну: «Запомні, так будзе заўсёды, калі ты не будзеш думаць сваёй галавой. Азіраючыся на меркаванне іншых людзей і жывучы іх розумам, ніколі нікому не дагодзіш. Таму слухай уласнае сэрца і будзь сабой».

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

Сямейная газета

Выпуск № 17 (220)

Тыя, хто побач

Мастацкі кіраўнік тэатра імя М. Горкага Сяргей КАВАЛЬЧЫК:

«Самае каштоўнае ў жыцці даецца бясплатна»

Ці замінае сумесная праца шлюбу? Якіх прынцыпаў прытрымлівацца ў выхаванні дзяцей? Чаму тэатр працягвае цікавіць гледачоў? Як сёння варта выбіраць рэпертуар? Сваімі думкамі пра гэта і іншае дзеліцца прадаўжальнік вядомай творчай дынастыі, шматдзетны тата, мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага Сяргей Кавальчык.

МЕСЦА СІЛЫ

— Часта чуеш, што сямейныя саюзы творчых людзей нетрывалыя. Не згодны. Мне здаецца, прафесійная прыналежнасць у гэтым не адыгрывае ніякай ролі. Мае бацькі (рэжысёры і педагогі Міхаіл Станіслававіч і Эмілія Міхайлаўна Кавальчыкі. — **Аўт.**) пражылі разам больш як паўстагоддзя, ім ніяк не перашкодзіў іх род заняткаў. І нам з Вікай (актрысай Вікторыяй Кавальчык. — **Аўт.**) агульнае месца працы не замінае ў шлюбе. Пасля рэпетыцый і спектакляў, фізічна знаходзячыся дома, у думках я яшчэ нейкі час звычайна ў тэатры. Жонка часам пытаецца: «Ты калі дадому вернешся?» Тады разумею: час пераключацца. Затое нам заўсёды ёсць пра што пагаварыць адно з адным — і гэта відавочны плюс.

Я перакананы ў тым, што сям'я павінна будавацца на каханні. Калі яго няма, то шлюб, напэўна, акажацца нетрывалым. Але каханне — не данасць, яго не атрымліваюць гатовым, яно залежыць ад дваіх. На мой погляд, моцныя саюзы ўтвараюцца паміж людзьмі, якія прымаюць адно аднаго такімі, якія яны ёсць, з усімі добрымі якасцямі і недахопамі, не імкнучыся перарабіць і перакроіць пад сябе. У кожнай сям'і бываюць цяжкасці, ва ўсіх здараюцца канфлікты. Аднак гэта не нагода расставацца, разбураць шлюб. Калі сужэнцы шануюць адносіны, то пры жаданні заўсёды можна знайсці выйсце, утаймаваць эгаізм, вырашыць супярэчнасці, захаваць стасункі.

У нашай сям'і няма цвёрдага падзелу на мужчынскія і жаночыя абавязкі. Зразумела, я не прыцягваю Віку капаць градкі на дачы. Але з задавальненнем гатую сняданкі, няхай простыя і традыцыйныя: аўсяную кашу, яечню, каву. І малодшы з дзетак, Юра, упэўнена адчувае сябе на кухні. Часам вяртаемся з Вікай увечары пасля спектакля, а дома нас чакае вячэра, прыгатаваная сынам. І мы яму ад душы ўдзячныя. Няма праблемы — каму памыць посуд, прыбраць у кватэры.

Для мяне сям'я — базавая жыццёвая каштоўнасць. Гэта месца сілы. Дзе яшчэ мы можам «выдыхнуць», пагаварыць адкрыта, падзарадзіцца энергіяй, з кім мы гатовы пераадолець любыя цяжкасці? У каго я знаходжу падтрымку, калі нешта не ладзіцца? Перш за ўсё — у жонкі, а яна — у мяне. Разам лягчэй пераадольваць любыя рыфы.

(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)

Прыклад для пераймання

СЕМ КОЛЕРАЎ «ВЯСЁЛКІ»

Адзін дзень у садку сваёй мары

На мінулым тыдні я трапіла ў дзіцячы садок, пра які даведалася зусім выпадкова, — ад музычнага кіраўніка з аграгарадка Наваселле, што пад Мінскам, Таццяны Глебік. Пазнаёміліся мы, што сімвалічна, на майстар-класе па беларускіх народных танцах у музеі Якуба Коласа. «А прыязджайце да нас у садок, не пашкадуеце! — запрасіла тады Таццяна. — Мы ўжо шмат гадоў далучаем дзяцей і іх бацькоў да традыцый нашых продкаў. І якраз напрыканцы верасня плануем зладзіць традыцыйнае абрадавае дзеянне «Багач».

ПРА СЯВЕНЬКУ ДЫ ПШАНІЧНЫ КАЛАСОК

І вось я ў Навасельскім дзіцячым садку. Увечары па дзетак прыйшлі мамы і таты, але ніхто з іх не спяшаецца дадому. Усе ідуць у музычную залу, дзе ўладкоўваюцца за сталікамі — імправізаванымі хатамі.

Да 21 верасня, дня Нараджэння Прасвятой Багародзіцы, звычайна заканчваліся ўсе работы па зборы збожжа. Менавіта ў гэты дзень восеньскага раўнадзенства вяскоўцы і святкавалі «Багач». Упрыгожвалі апошні сноп і абыходзілі з ім вёску. У кожным двары ім у сявеньку клалі па жменьцы зярнятак. Затым гэтыя дары як сімвал вясковай еднасці пакідалі на покуці ў хаце самага гасцінага гаспадара. Менавіта да ўдзелу ў гэтым абрадзе супрацоўнікі і выхаванцы дзіцячага садка далучылі бацькоў. Дарэчы, пшаніца, якую тыя клалі ў сявеньку, незвычайная. Яе ўласнаручна вырасціў, зжаў сярпом ды абмалаціў цэпам мясцовы жыхар Анатоль Цітавец.

Усе ахвотныя маглі павучыцца ў Хрысціны ЛЯМБОВІЧ ткаць паясы. За гэтай справай я і сфатаграфавала Таццяну КВЕЦЕНЬ з дачушкай Васілісай.

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)

Патанулыя ў сетках

Як адарваць дзяцей ад гаджэтаў

Па даных анкетавання, каля паловы дзяцей і падлеткаў сядзіць за камп'ютарам у выхадныя больш за тры гадзіны, 18 % — больш за дзве гадзіны. Каля 40 % тры гадзіны і больш гуляюць у камп'ютарныя гульні. Пры гэтым пакутуе зрок, постаць, развіваюцца залежнасць і псіхічныя расстройствы, агрэсія і нават суіцыдальныя паводзіны. Ці можна мінімізаваць гэтыя рызыкі і як зрабіць так, каб дзіця асвойвала лічбавыя тэхналогіі і разам з тым не страціла фізічнае і псіхічнае здароўе, расказалі спецыялісты.

УДАР ПА ВАЧАХ

У Беларусі за апошнія 10—12 гадоў як агульная, так і пярвічная дзіцячая захваральнасць застаюцца прыкладна на адным узроўні. Пры гэтым, як адзначае **загадчык кафедры гігіены і медыцынскай экалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, доктар медыцынскіх навук, прафесар Алена ГУЗІК,** ва ўзросце ад 5—9 да 15—17 гадоў расце колькасць хвароб цэнтральнай нервовай, касцёва-мышачнай, эндакрыннай сістэм, захворванняў вока, псіхічных і расстройстваў паводзін.

У дашкольнікаў па выніках прафілактычных аглядаў парушэнні зроку за 15 гадоў павялічыліся больш чым у два разы, асабліва ў гарадскіх дзяцей. Бацькі павінны ўлічваць, што істотна ўплывае на здароўе нізкая рухальная актыўнасць, парушэнне структуры харчавання і рэжыму сну.

— Даследаванне, якое праводзілі нашы спецыялісты, паказала, што ў вучэбныя дні каля трэці дзяцей з 5 да 11 класа спяць сем гадзін і менш, а ў выхадныя дні гэта лічба складае 7,5 %, — кажа Алена Гузік.

Адным з аспектаў, які сёння вызначае здароўе дзяцей і падлеткаў, з'яўляюцца гаджэты.

— Першае, з чым мы сутыкаемся, — вымушаная працоўная поза. Калі мы чытаем папяровую кнігу, гэта адлюстраваны тэкст. Калі чытаем на смартфоне, гэта экран, які свеціцца. Да таго ж кніга — гэта чорна-белая гама, а на экране — розныя адценні колеру, і воку заўсёды неабходна да гэтага адаптавацца, — пералічвае загадчык кафедры. — Калі працуем з тэлефонам, нашаму воку варта моцна напружвацца. Кантрасны фон экрана таксама з'яўляецца фактарам рызыкі для зроку. Эвалюцыйна так склалася, што мы пераважна глядзім удалечынь. Калі ж працуем з камп'ютарам ці тэлефонам, нашым вачам дастаткова доўга даводзіцца напружвацца, бо мы глядзім перад сабой. За кошт пералічаных фактараў развіваюцца розныя парушэнні зроку.

Дарэчы, ужо з 2000-х гадоў, калі камп'ютары і іншыя гаджэты пачалі атрымліваць шырокае распаўсюджанне, у еўрапейскім рэгіёне парушэнні зроку ў дзяцей павялічыліся на 30—40 %, а ў Паўднёва-Усходняй Азіі — аж да 70 %. І спецыялісты прагназуюць, што ў найбліжэйшыя 10 гадоў колькасць парушэнняў зроку павялічыцца яшчэ на 50 %.

— Калі літара ў кнізе — суцэльнае адлюстраванне, то на экране — кропкавае. І гэта дадатковы фактар рызыкі, як і мірганне экрана. Пры рабоце з экранам ёсць дадатковы сіні колер, які аказвае неспрыяльнае ўздзеянне і павышае рызыку ўзроставай дэгенерацыі сятчаткі. Акрамя таго, сіні колер блакіруе ў вячэрні час выпрацоўку мелатаніну, што парушае наш начны сон, цыркадныя рытмы. Таму за гадзіну да сну не

рэкамендуецца карыстацца тэлефонам. Ёсць, дарэчы, кам'ютарныя праграмы, якія падаўляюць сіні колер, у вячэрні час іх можна выкарыстоўваць, — дадала Алена Гузік.

ВЫБРАЦЬ ГАДЖЭТ ПРАВІЛЬНА

Калі выбіраеце прыстасаванне для дзіцяці сярод камп'ютара, ноўтбука, планшэта ці тэлефона, варта выбраць камп'ютар, бо гэта вялікі экран і зручнае працоўнае месца, а значыць, меншы фактар рызыкі для касцёва-мышачнай сістэмы і зроку. Калі пры чытанні стаіць выбар паміж камп'ютарам і электроннай кнігай, то лепш аддаць перавагу апошняй. Школьнікам не рэкамендуецца выкарыстоўваць смартфоны ў вучэбных мэтах — лепш нехай гэта будуць камп'ютар ці ў абмежаванай колькасці планшэт.

Яшчэ адзін важны момант — святло. Ні ў якім светнай арганізацыі аховы здароўя, увогуле не рэкамендуюцца ні камп'ютары, ні тэлефоны. Ад двух гадоў — да гадзіны агульнага часу, але чым менш, тым лепш.

Парушэннямі фізічнага здароўя, на жаль, уплыў гаджэтаў не абмяжоўваецца. Яны вядуць да фарміравання залежнасці.

— Маецца шмат тэрмінаў — інтэрнэт-залежнасць, залежнасць ад гульняў, экранная залежнасць, але суцнасць усіх іх зводзіцца да аднаго: немагчымасць кантраляваць узаемаадносіны падлетка з носьбітам інфармацыі. У цэлым гэта адносіцца да залежнасці па сусветнай класіфікацыі хвароб, — тлумачыць **загадчыца лабараторыі праблем здароўя дзяцей і падлеткаў Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Маці і дзіця», прафесар, доктар медыцынскіх навук Маргарыта ДЗЕВЯЛТОЎСКАЯ.**

Залежнасць ад гаджэтаў мае ўсё тыя ж прыкметы, што і іншыя залежнасці. Асноўная яе прыкмета — няздольнасць кантраляваць сваё карыстанне гаджэтам.

— Залежнасць ад інтэрнэту ці гаджэтаў выклікае змяненні ў структурах галаўнога мозгу, у першую чаргу ў лобных долях, і яны такія ж, як пры залежнасці ад псіхаактыўных рэчываў. Гэта структурныя змяненні мозгу, і яны прыводзяць да больш глыбокіх змяненняў псіхікі, чым проста псіхалагічныя праблемы, — кажа Маргарыта Дзевялтоўская.

Мозг дзіцяці актыўней за ўсё развіваецца да трох гадоў, і сёння ў многіх сем'ях гаджэты становяцца спадарожнікам дзіцяці ў такі ўразлівы перыяд.

— Чым большы ў гэты час уплыў, тым горш растуць нейроны. Пасля трох гадоў уздзеянне экрана таксама ідзе, але не ў такой ступені. Сёння нярэдкія сітуацыі, калі маленькае дзіця глядзіць мультфільмы, і гэта з'яўляецца прадметам гонару бацькоў. Яму 9-10 месяцаў, а яно разумее, што на кнопкі тэлефона варта націскаць. А калі яму 1,5 года і яно можа самастойна ўключыць мультфільмы, бацькі лічаць, што гэта

ПРАДМЕТ БАЦЬКОЎСКАГА ГОНАРУ

Дзецям да двух гадоў, паводле рэкамендацый Су-

Калі выбіраеце прыстасаванне для дзіцяці сярод камп'ютара, ноўтбука, планшэта ці тэлефона, варта выбраць камп'ютар, бо гэта вялікі экран і зручнае працоўнае месца, а значыць, меншы фактар рызыкі для касцёва-мышачнай сістэмы і зроку.

прыкмета яго высокага кагнітыўнага ўзроўню і разумовых здольнасцяў. На жаль, сітуацыя мае і зваротны бок, калі атрыманне інфармацыі праз экран уплывае не толькі на структуры галаўнога мозгу і псіхіку дзіцяці, але і на інтэлектуальныя функцыі. Уплыў экрана прыводзіць да кагнітыўнай дэзарганізацыі, — адзначае спецыяліст.

Трэба сказаць, што ўплыў тых жа мабільных тэлефонаў дзіця адчувае ўнутрывантробна.

— Калі нашы маладыя маці, будучы цяжарнымі, кантактуюць з такімі ж сябро-ўкамі анлайн, дзіця ўнутрывантробна пазбаўлена тактыльнай, сенсорнай, аўдыявізуальнай стымуляцыі. Калі кажам пра рост выпадкаў аўтызму, заўсёды пра гэта трэба памятаць. Аўтызм пачынаецца з таго, што ўнутрывантробна ў дзіцяці няма адэкватнага кантакту са знешнім светам. Далей, калі яно атрымлівае ўсю інфармацыю праз экран, развіваецца ўспрыманне візуальнае, аўдыяльнае, але абсалютна адсутнічае сенсорнае або тактыльнае, няма і камунікатыўных навыкаў, звязаных з жывым кантактаваннем, — дадае Маргарыта Дзевялтоўская.

Залежнасць вядзе да таго, што дзіця знаходзіцца ў камфортным для сябе свеце, дзе ўсе сітуацыі вырашаюцца простым націсканнем кнопак. Калі ж узнікаюць складаныя сітуацыі ў рэальным жыцці, яно імкнецца вярнуцца ў зручны для яго свет інтэрнэту.

— Дзіця адчувае эйфарыю, і ў яго камфортны стан, калі яно ў сваім любімым свеце, і ўсе спробы яго адлучыць выклікаюць раздражненне і агрэсію. Але сітуацыя такая, што дзіця мусіць уступаць ва ўзаемадзеянне з рэальнасцю і навакольнымі. І гэта дастаткова часта прыводзіць да дэпрэсій, стрэсавых расстройстваў і суіцыдальных паводзін, бо мадэлі паводзін, якія вядуць да адсутнасці адказнасці перад рэаліямі жыцця, дзеці таксама бяруць у інтэрнэце. У інтэрнэце лёгка кагосьці забіваюць, на новым узроўні ён ажывае, і ў дзяцей нівеліруецца паняцце смерці. Карані падлеткавай дэпрэсіі і суіцыдаў палягаюць у тым, што дзіця не можа знайсці сябе ў рэальным свеце, — рэзюмуе Маргарыта Дзевялтоўская.

ЯК ВЫЗНАЧЫЦЬ ЗАЛЕЖНАСЦЬ?

Педагог-псіхолаг аддзела псіхалагічнай дапамогі ў крызісных сітуацыях Рэспубліканскага цэнтра псіхалагічнай дапамогі Дзмітрый СЕННІКАЎ вылучыў дзве асноўныя прычыны, па якіх развіваецца залежнасць. Першая — знешняя, гэта звычка вырашаць любую праблему з дапамогай гаджэтаў. Другая — унутраная, гэта недастатковая здаволенасць умовамі рэальнага жыцця.

— Безумоўна, калі мець на ўвазе падлетка, то ўсе індывідуальныя, ва ўсіх ёсць сваё разуменне адэкватных умоў рэальнага жыцця. І тут часта неабходна разам з псіхолагам гэта прапрацоўваць.

Выкарыстанне гаджэтаў нясе і такія небяспекі, як праблема з самаацэнкай, стрэсаўстойлівасцю, неразуменне сябе, свайго эмацыянальнага складніка і эмацыянальнага праяўлення навакольных. Сярод небяспек можна вылучыць і рызыку стаць ахвярай кібербулінгу і махлярства.

На пачатковым этапе вызначыць залежнасць няроста. Але ёсць шэраг праяў, якія могуць даць бацькам падставы задумацца і прыняць канкрэтныя меры. У першую чаргу, замкнёнасць і літаральна невыпусканне гаджэта з рук. Часта спроба бацькоў забрацъ гаджэт суправаджаецца праяўленнем агрэсіі дзіцяці ці падлетка, падману, непаслухмянасці. Кантактаванне з сябрамі таксама вядзецца анлайн.

Ва ўзросце ад 6 да 12 гадоў агульны экранны час не павінен перавышаць больш за дзве гадзіны ў дзень, у старэйшых за 12 гадоў — 3,5 гадзіны. У 6—8 гадоў рэкамендуецца працаваць на камп'ютары 10 хвілін, пасля чаго рабіць 30-хвілінны перапынак.

— Часта ёсць спробы дамовіцца: зраблю дамашняе заданне, калі дагуляю. І гэта «дагуляю» зацягваецца, пакутуе дамашняе заданне, рэжым дня, сон, — расказвае Дзмітрый Сеннікаў.

ЯКІ ВЫХАД З СІТУАЦЫІ?

Найперш гэта кантроль дзіцяці і гаджэта.

— Бацькі, якія маюць даверлівыя адносіны са сваімі дзецьмі, у якіх наладжаны ў сям'і традыцыі і рытуалы, маюць больш шанцаў на кантакт са сваімі нашчадкамі, чым тыя, хто з'яўляюцца толькі назіральнікамі іх жыцця, — адзначае псіхолаг.

Але кантроль таксама павінен быць правільны.

— Адна справа: я сказала — значыць, так і будзе, бо я твая маці. І іншая — дзе існуе момант дамоўленасці з дзіцем. Ведаючы, што яно робіць у інтэрнэце, бацькі могуць папярэдзіць спробы махлярства, кібербулінгу, нават вызначыць, дзе знаходзіцца іх дзіця, — кажа педагог-псіхолаг.

Калі вы гатовы зрабіць падарунак дзіцяці ў выглядзе гаджэта, адразу дамоўцеся аб правілах яго выкарыстання: як, колькі і дзе. Увядзіце звычку, што сняданак, абед і вячэра праходзяць без гаджэтаў, увядзіце «разгрузачны дзень»: калі ўся сям'я не выкарыстоўвае гаджэты. Памятайце, што асабісты прыклад бацькоў мае значна большую вагу, чым проста словы ці забароны.

Алена КРАВЕЦ.

СЕМ КОЛЕРАЎ «ВЯСЁЛКІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Затым бацькі разам з дзеткамі выйшлі на сцэну з сучаснымі сявенькамі і вучыліся сеяць збожжа. І ўсё гэта пад акампанемент беларускіх народных песень «Сею-вею, пасяваю...» ды «Пасеялі дзеўкі лён». Ад такога знаёмства ў форме гульні з цяжкой працай нашых продкаў і малыя, і дарослыя былі ў захапленні. Потым дзеці вучылі сваіх бацькоў танцаваць кракавяк. Разам з імі адплясвалі ў нацыянальных строях усе педагогі садка, у тым ліку і яго загадчыца.

— Адчуваецца, што ў вас тут не проста калектыў, а сапраўдная сям'я, дзе ўсе гараць агульнай ідэяй, — сказала я ёй падчас танца.

— Так і ёсць, — усміхаецца **Вікторыя Сабалеўская**. — Усе нашы педагогі — рукадзельніцы. Настаўнік-дэфектолаг захапляецца вышыўкай, музычны кіраўнік і выхавацелька — выцінанкай, кіраўнік фізічнага выхавання шые лялькі і шмат чаго яшчэ... Усе без выключэння натхнёныя працай з дзецьмі, актыўна ўдзельнічаем у розных конкурсах і займаем прызавыя месцы *(у гэтым я пераканалася сама на калідоры ўся сцяна завешана граматамі і дыпломамі.* — **Аўт.***)*.

Пасля майстар-класа па танцах усіх запрасілі ў тэатральную студыю «Жароncы», дзе маленькая дзяўчынка «прадавала» за ўсмешку білеты на спектакль «Пшанічны каласок». Што цікава, галоўнымі героямі тэатральнай пастаноўкі — курачкай, індыком ды гусаком — зусім нечакана для сябе сталі бацькі. Трэба было бачыць, з якой непадробнай цікавасцю назіралі дзеткі за імправізацыяй дарослых!.. Пасля спектакля ўсе мамы і таты атрымалі праграмку спектакля, на зваротным баку якой — тэкст казкі, што гучала са сцэны. Каб дома пачытаць яе дзецям перад сном.

Дзеці разам са сваім музычным кіраўніком Таццянай ГЛЕБІК навучылі мяне гуляць у «Мэма». Але не ў звычайную гульню, а ў нашу, аўтэнтычную.

Галоўнымі героямі казкі нечакана для сябе выступілі бацькі.

ПРА ПОКУЦЬ ДЫ ВЫЦІНАНКІ-ЗАБАЎЛЯНКІ

Затым усе завіталі ў этнаграфічны музей «Спадчына», аформлены ў выглядзе вясковай хаты, дзе пры дапамозе Васілісы і яе мамы Таццяны пазнаёміліся з новым словам. «Бог жыве на небе, Бог жыве ў царкве. А ў вясковай хаце дзе ён, Бог, жыве?» — загадала загадку дзяўчынка. Правільна, гэта покуць — галоўнае месца ў хаце, дзе пад столлю вісяць абразы з выявамі Ісуса Хрыста і святых.

— Музей — цудоўны дапаможнік для нашых выхавацеляў, — кажа яго гаспадыня Ларыса Крыловіч. — Напрыклад, тэма заняткаў — «Посуд». Пагаварылі пра сучасны, а потым прыйшлі і паглядзелі, які ён быў раней. А чулі б вы, як дзяўчаткі з Таццянай Станіславаўнай калыханкі спяваюць! Падыходзяць да калыскі і гудуць, як той вецер у трубе! Такое харство, аж плакаць хочацца. «Спі, сыночак міленькі, галубочак сізенькі. Мой сыночак будзе спаць, а я буду калыхаць».

Дарэчы, **Таццяна Глебік** кажа, што менавіта праз песні вельмі добра вучыць беларускую мову. А яшчэ перад святам, пакуль чакалі бацькоў, дзеці разам са сваім музычным кіраўніком навучылі мяне гуляць у «Мэма». Але не ў звычайную гульню, а ў нашу, аўтэнтычную, дзе карткі з выявамі герояў беларускіх народных казак выкананыя ў тэхніцы выцінанка. Вось вам і яшчэ адна падказка, як зрабіць мінулае цікавым для сучасных дзяцей.

— Музей тут з'явіўся дзякуючы былой загадчыцы нашага дзіцячага садка Кацярыне Пятроўне Мазуркевіч, — працягвае Ларыса Антонаўна. — Адзін з першых экспанатаў — лапці, якія, спяваючы беларускія народныя песні, на вачах у дзяцей пляла яе маці Аніcся Яўсееўна. Спецыяльна для нашага садка ў 1991 годзе тутэйшая майстрыца Леаніда Якаўлеўна Супрановіч зрабіла з паперы набожнік-выцінанку. Мы хочам запрасіць яе ў найбліжэйшы час да нас у музей, каб яна правяла для дзетак і іх бацькоў майстар-клас. Ёй, думаю, будзе прыемна ўбачыць, што мы столькі гадоў беражом яе набожнік. Усё, што ёсць у музеі, сабрана супрацоўнікамі дзіцячага садка і бацькамі. Падчас мерапрыемстваў пытаемся ў іх: «Можа, у каго што захавалася?», дык многія адгукаюцца, прыносяць нам старыя рэчы.

У той вечар дзеці з дапамогай бацькоў рабілі яшчэ і лялек-зернавушак, якіх забралі з сабой дадому — на памяць.

— Наступны раз будзем збірацца, каб навучыцца рабіць фітагабелены, — кажа Таццяна Глебік. — Каб паказаць дашкалятам глыбіню традыцый і мудрасць нашага народа, пастаянна шукаем цікавыя формы работы. Адна з іх — куток дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Горад майстроў». Рэгулярна збіраемся і пад кіраўніцтвам умельцаў робім штосьці сваімі рукамі. У прыватнасці, майстрыца з Валожынскага раёна Хрысціна Лямбовіч дапамагае дакрануцца да ткацтва. На «ўра» прайшла акцыя, калі адзін пояс ткалі ўсе па чарзе: бацькі, дзеці, госці. Вучыліся плесці вянкі з бярозавых галінак, рабілі выцінанкі па гатовых лякалах, васковыя свечкі, розныя лялькі. Самае каштоўнае, калі бацькі самі праяўляюць актыўнасць. Адна матуля на Раство праводзіла майстар-клас па роспісе імбірных пернікаў. Дакрануцца да нашага беларускага золата нам дапамагае шматдзетная мама Святлана Ярашэвіч, майстар па саломцы, раней яе дзеткі таксама хадзілі ў наш садок. Ганна Станіславаўна Бяляева, бабуля Мацвейкі, вучыла вязаць кручком званочкі і сняжынкі на ёлку, а на Вялікдзень — абвязваць велікодныя яйкі. Праблема сучасных дзяцей у тым, што яны практычна не бачаць, як бацькі штосьці робяць рукамі. Таму, пакуль мама вяжа, дзеці побач гуляюць у настольныя гульні ці робяць елачныя цацкі з нітак.

ПРА ХАТУ БАЦЬКОЎ ДЫ МАГІЧНУЮ СІЛУ ПЕСНІ

Сапраўдным падарункам для ўсіх стаў Віталь Карпанаў з ансамбля «Дразды». Ён прыехаў на матацыкле, каб прыняць удзел у пасяджэнні бацькоўскага клуба і паспяваць разам беларускія песні. Так супала, што напярэдадні ў гаспадыні этнаграфічнага музея «Спадчына» Ларысы Крыловіч быў дзень нараджэння. Калегі ведалі, што яе самыя любімыя песні «Хата бацькоў» і «Беларуская мова», і вырашылі зрабіць ёй сюрпрыз. Ажно слёзы навярнуліся на вочы, калі дзеткі і дарослыя пачалі падпяваць «Ты бабуліна казка, ты матуліна ласка, ты гаючая краска, ты ад болю замова. Хлеб на чыстым абрусе, Храм, дзе Богу малюся, ты душа Беларусі — беларуская мова». Потым Віталь разам з усімі танцаваў кракавяк і наведаў музей, дзе яму на памяць аб дзіцячым садку падарылі абраз з выявай Багародзіцы, вышыты бабуляй Настассі Якубовіч Нінай Іванаўнай Якубовіч.

— Мы тут вучым дзяцей беларускім песням ды танцам, а прыходзяць яны дадому, напяваюць калыханку ці паказваюць бацькам той жа самы кракавяк, і часам не маюць водгуку, — кажа Таццяна Глебік. — Каб яны былі на адной хвалі, мы і вырашылі стварыць бацькоўскі клуб «Вясёлка». Ён абагульняе сем відаў дзейнасці, як сем колераў вясёлкі. Спяваем беларускія песні, ставім народныя казкі з дапамогай розных відаў тэатра, знаёмімся з традыцыйнымі танцамі, гуляем у гульні нашых продкаў, узгадваем забытыя побытавыя рэчы, робім сувеніры сваімі рукамі ў традыцыйных тэхніках, спрабуем нацыянальную ежу... Напрыклад, на Гуканне вясны дзеці з бацькамі рабілі птушачак з цеста. Падчас капуснай вечарыны частаваліся пірагом з капустай. На Каляды да бацькоў прыходзяць дзеці-калядоўшчыкі, а бацькі паказваюць дзецям тэатралізаваную пастаноўку — гісторыю нараджэння Хрыста. Стараемся, каб у нашых вячорках, падчас якіх знаёмімся з традыцыямі святкаванняў Раства Хрыстова, Масленіцы, Вялікадня, Пакроваў, удзельнічалі ўсе, у нас такога не бывае, каб бацькі проста глядзелі, як дзеці штосьці робяць. Бо раней менавіта дзеці сядзелі за печкай і назіралі, як бацькі спявалі, танцавалі, і такім чынам вучыліся ад дарослых. Бацькі, дарэчы, нам вельмі дапамагаюць. Адна матуля намалявала лялек для тэатралізаванай пастаноўкі казкі «Рэпка», другая з густам упрыгожыла саламянымі кветкамі сцэну. Наш садок цесна ўзаемадзейнічае з бацькамі, бо ўсё пачынаецца з сям'і.

«Наш навасельскі садок — адзін з найлепшых у раёне. Я сама сюды хадзіла, цяпер ваджу сваю дачку, — кажа мама Васілісы Таццяна. — Нам, лічу, вельмі пашанцавала з педагогамі. Мы павінны ведаць традыцыі нашых продкаў, сваю мову, культуру, фальклор, і вучыць гэтаму дзяцей».

Дарэчы, звярнула ўвагу, што беларускія песні сапраўды маюць нейкую магічную сілу. Некаторыя бацькі прыйшлі на свята стомленыя пасля працоўнага дня. Але падчас мерапрыемства ўсмешкі не сыходзілі з іх твараў.

Яшчэ звярнула ўвагу, што на сценах у калідоры у арыгінальных бярозавых рамках вісяць фотаздымкі знакамітых мясцін Беларусі — Косаўскага ды Гомельскага палацаў, Нясвіжскага ды Мірскага замкаў...

— Раней у нас тут размяшчаліся ў рамках выцінанкі, а цяпер іх замянілі, — распавяла Ларыса Антонаўна. — У найбліжэйшы час нанясём на іх QR-коды, па якіх бацькі змогуць перайсці і атрымаць больш падрабязную інфармацыю. А магчыма, натхняцца і звозяць дзіця на экскурсію. Самая вялікая ўзнагарода і важкі вынік нашай працы, калі зярняткі, пасеяныя ў дзіцячым садку, прарастаюць у дарослым жыцці нашых выхаванцаў.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК, фота аўтара.

Мінскі раён.

Больш фотаздымкаў глядзіце на сайце «Звязды».

ТРЫ ДНІ ЦІШЫНІ

Гінеколаг — пра небяспекі падлеткавай цяжарнасці

Паводле статыстыкі, у сярэднім «сексуальны дэбют» у падлеткаў адбываецца ў 16 гадоў. Сумеснымі намаганнямі ўрачоў, псіхолагаў і педагогаў удаецца стрымліваць колькасць ранніх цяжарнасцяў. Аднак пытанне застаецца актуальным.
Аб тым, як адбіваецца «цікавае становішча» на здароўі юнай мамы, якія міфы пра падлеткавую цяжарнасць не маюць навуковых абгрунтаванняў, у чым небяспека першага аборту і чаму перад ім даецца «тры дні цішыні», расказвае ўрач акушэр-гінеколаг 11-й гарадской паліклінікі Мінска Яўгенія МАСКАЛЬЧУК.

— У якім узросце можа зацяжарыць дзяўчынка і які ўзрост лічыцца аптымальным для наступлення цяжарнасці?

— Падлеткавая цяжарнасць — глабальная з'ява, якая мае дакладна ўстаноўленыя прычыны і прыводзіць да сур'ёзных медыцынскіх, сацыяльных і эканамічных наступстваў. Згодна з разлікамі, у рэгіёнах, якія развіваюцца, цяжарнасць штогод наступае ў 21 мільёна дзяўчынак ва ўзросце 15—19 гадоў, прыкладна 12 мільёнаў з іх нараджаюць.

Аптымальным узростам наступлення цяжарнасці з медыцынскага пункту гледжання лічыцца 20—35 гадоў, калі ўсе сістэмы і органы дасягнулі свайго развіцця, рызыка храмасомных анамалій мінімальная і, як правіла, адсутнічаюць спадарожныя саматычныя захворванні. Аднак цяжарнасць можа наступіць і ва ўзросце 9 гадоў, а пры заўчасным палавым паспяванні — яшчэ раней.

Пасля першаснага звароту па псіхалагічную кансультацыю даецца «тры дні цішыні» — у гэты перыяд не праводзіцца перарыванне. Затым дзяўчынка паўторна наведвае спецыяліста.

— Многія дзяўчынкі не ведаюць першасных прыкмет цяжарнасці. Раскажыце пра іх.

— Дыягностыка цяжарнасці ў юным узросце грунтуецца на выяўленні тых жа меркаваных, верагодных і несумненных прыкмет, што і ў дарослых жанчын, аднак дыягназ устанаўліваецца нярэдка са спазненнем, гэта значыць, са з'яўленнем менавіта дакладных прыкмет.

Асноўнай перашкодай для правільнай і своечасовай дыягностыкі з'яўляецца сама юная цяжарная, якая па прычыне шэрагу абставінаў або не падазрае аб цяжарнасці, або хавае з'яўленне сумнеўных (суб'ектыўных) прыкмет. Часам упершыню даведваецца пра цяжарнасць чалавек, якому дзяўчынка асабліва давярае: школьная настаўніца, важатая і іншыя.

Нярэдка першым дыягназ цяжарнасці ставіць участковы педыятр пры аглядзе і пальпацыі жывата. Сімптомамі цяжарнасці з'яўляецца затрымка менструацый, станоўчы тэст ХГЧ і наяўнасць плоднага яйца ў матцы паводле ўльтрагукавога даследавання. Астатнія сімптомы — млоснасць, павелічэнне жывата — могуць адсутнічаць. Таму, калі дзяўчынка жыве палавым жыццём і ў яе ёсць затрымка менструацый, самы просты, танны і неінвазіўны метад дыягностыкі — мачавы тэст на цяжарнасць, які выконваецца ў ідэале раніцай з першай порцыяй мачы.

— Існуе мноства памылковых поглядаў на цяжарнасць сярод падлеткаў — напрыклад, нельга зацяжарыць пасля першага палавога акту, цяжарнасць не наступіць да 18 гадоў, цяжарнасць немагчымая пры занятках сексам падчас менструацыі, у становішчы стоячы і іншае...

— Цяжарнасць можа наступіць у любой жанчыны ці дзяўчынкі, якая жыве палавым жыццём. На гэтым можна паставіць кропку. Не бывае 100-працэнтнага сродку кантрацэпцыі. Здараюцца авуляцыі падчас менструацый, сперматазоід здольны апладніць яйцаклетку яшчэ як мінімум тры дні пасля эякуляцыі. Няважна, першы гэта палавы акт ці не, калі сперматазоід трапіць у перыавуляторны перыяд, — цяжарнасць наступіць.

— У чым небяспека цяжарнасці ва ўзросце 13—17 гадоў для будучай мамы і для плода?

— Дзяўчынка ў падлеткавым узросце мае яшчэ не зусім спелую гармональную рэгуляцыю, лабільнасць нервовай сістэмы, часта анатамічна вузкі таз. Ход і вынікі родаў істотна залежаць ад прыналежнасці дзяўчынкі да пэўнай узроставай групы. Калі ў 14 гадоў і маладзей працэнт цяжкіх ускладненняў вялікі, то ў групе 15—17 гадоў працэнт ускладненняў ніжэйшы.

У парадзіх ва ўзросце маладзей за 14 гадоў можна вылучыць наступныя асноўныя ўскладненні падчас родаў. Гэта клінічная неадпаведнасць паміж галоўкай плода і тазам маці, слабасць родавай дзейнасці, траўмы родавых шляхоў, гіпатанічны крывацёк.

У той жа час у парадзіх 15—17 гадоў структура ўскладненняў крыху іншая: хуткія роды, першасная слабасць родавай дзейнасці, разрывы шыйкі маткі і пахвіны, гіпатанічны крывацёк.

Такім чынам, большая частка ўскладненняў абавязана сваім генезам парушэнню скарачальнай здольнасці маткі, абумоўленаму як няспеласцю звёнаў, якія рэгулююць гэту дзейнасць, так і непаўнацэннасцю злучальных тканак (міяметрыя). Для дзіцяці неспрыяльныя наступствы могуць быць звязаны з нараджэннем з нізкай вагой.

— Ці выконваюцца ў нас медыкаментозныя аборты? Такі метад больш ашчадны ў параўнанні з хірургічным? У чым яго небяспека?

— Пры перапыненні непажаданай цяжарнасці выкарыстоўваюцца два метады — хірургічны і медыкаментозны. Медыкаментозны спосаб добры тым, што поласць маткі застаецца інтактнай, гэта значыць, не падвяргаецца хірургічным маніпуляцыям. Праводзіцца ён да тэрміну цяжарнасці 6-7 тыдняў і ў ідэале пад кантролем медперсаналу ў стацыянары.

Аптымальным узростам наступлення цяжарнасці з медыцынскага пункту гледжання лічыцца 20—35 гадоў, калі ўсе сістэмы і органы дасягнулі свайго развіцця.

Улічваючы, што цяжарная ў 15 гадоў дзяўчынка адчувае страх, яна «хаваецца» і па-дзіцячаму думае, што «ўсё само пройдзе». І калі ўсведамляе, што цяжарнасць не пройдзе, звяртаецца да гінеколага. І, як правіла, калі ўжо позна для медыкаментознага перарывання цяжарнасці, бо апроч самой працэдуры неабходны агляд, здача клінічных аналізаў, перадабортнае псіхалагічнае кансультаванне.

Пра яго хачу сказаць асобна. Пасля першаснага звароту па псіхалагічную кансультацыю даецца «тры дні цішыні» — у гэты перыяд не праводзіцца перарыванне. Затым дзяўчынка паўторна наведвае спецыяліста і прымае канчатковае рашэнне аб зыходзе цяжарнасці.

У выпадку, калі тэрмін цяжарнасці ці супрацьпаказанні не дазваляюць выканаць медыкаментозны аборт, выконваецца хірургічны — да 12 тыдняў цяжарнасці. І тут адбываецца ўмяшанне ў поласць маткі, пашырэнне канала шыйкі маткі. Пры выкананні гэтай маніпуляцыі ёсць рызыка гнойных ускладненняў, перфарацыі маткі, ранення суседніх органаў, крывацёку.

Як адаб'ецца такое ўмяшанне на наступных цяжарнасцях, прадказаць немагчыма: у кагосьці пройдзе ўсё добра, а нехта, на жаль, адчуе на сабе наступствы ў выглядзе бясплоддзя, невыношвання, паталогій прымацавання плацэнты, парушэння сілкавання і росту плода.

— Як засцерагчы дзяўчынку ад ранняй цяжарнасці?

— Мая задача як гінеколага — данесці да дзяўчынак інфармацыю аб наступствах, відах перапынення і спосабах кантрацэпцыі. На сёння існуюць эфектыўныя метады, з дапамогай якіх можна пазбегнуць непажаданай цяжарнасці. Яны не шкодзяць здароўю, не выклікаюць бясплоддзе і не парушаюць гарманальны фон.

Ідэальным лічыцца «двайны галандскі метад»: выкарыстанне бар'ерных сродкаў (прэзерватываў) для прафілактыкі заражэння інфекцыямі, якія перадаюцца палавым шляхам, і гарманальнай кантрацэпцыі для надзейнай абароны ад цяжарнасці. Пра прэзерватывы хачу адзначыць, што важна чытаць інструкцыю па іх выкарыстанні. Там апісана, як пазбегнуць разрыву, саслізгвання і іншых непажаданых момантаў.

Вельмі шмат міфаў склалася вакол гарманальных кантрацэптываў. Гэта даступны на сёння сродак кантрацэпцыі з высокай эфектыўнасцю. Дзяўчынкі і іх мамы транслююць боязь «гарманальных таблетак», пры гэтым забываючыся на рызыкі цяжарнасці і інфекцый, якія перадаюцца палавым шляхам. Калі дзяўчынка вядзе палавое жыццё, запалохванні і метад «а можа, пранясе» не спрацуюць.

Падлеткавая цяжарнасць — глабальная з'ява, якая мае дакладна ўстаноўленыя прычыны і прыводзіць да сур'ёзных медыцынскіх, сацыяльных і эканамічных наступстваў.

У Беларусі ёсць дзіцячая гінекалагічная служба. У даступнай форме з апісаннем усіх магчымых рызык, супрацьпаказанняў менавіта для кожнай канкрэтнай дзяўчынкі дзіцячы гінеколаг пракансультуе па пытаннях кантрацэпцыі. Мамам падлеткаў хачу сказаць: займайцеся палавым выхаваннем сваіх дзяцей, тлумачце, што іх бяспека на першым месцы, не адмаўляйце відавочнае, падтрымайце сваё дзіця ў паходзе да спецыяліста дзеля яго здаровай будучыні.

Алена КРАВЕЦ.

СЕМ ЦІКАВЫХ ФАКТАЎ

На думку экспертаў САЗ, колькасць цяжарных падлеткаў стала агульнасусветным адмоўным сацыяльным феноменам. Самае дрэннае тое, што, па даных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (САЗ), нараджэнне дзяцей у падлеткавым узросце мае шмат сур'ёзных наступстваў для юнай мамы і для малога. Асноўная прычына такой сітуацыі ў тым, што падлеткі менш ахвотна, чым дарослыя, звяртаюцца па кваліфікаваную дапамогу падчас родаў. Статыстыка, якая яшчэ зусім нядаўна была характэрна для так званых краін трэцяга свету, сёння расце і ў развітых дзяржавах.

❶ Кожная пятая дзяўчына ў свеце нараджае дзіця, не дасягнуўшы 18-годдзя. Гэта значыць, амаль 16 мільёнаў падлеткаў ва ўзросце ад 15 да 18 гадоў і 2 мільёны ва ўзросце да 15 гадоў становяцца маці.

❷ Тры мільёны дзяўчат ва ўзросце 15—19 гадоў штогод робяць аборты. Натуральна, не заўсёды гэтая аперацыя праходзіць без наступстваў, і таму асноўнай прычынай смерці сярод дзяўчат ва ўзросце 15—19 гадоў з'яўляюцца аборты і ўскладненні пасля іх.

❸ На 50 % часцей бываюць выпадкі мёртванароджання і смерці нованароджаных у маці-падлеткаў, чым у мам ва ўзросце 20—29 гадоў. Для вялікай колькасці народаў шлюбы з падлеткамі і ранняе мацярынства — гэта норма.

❹ Больш за 30 % дзяўчынак выходзяць замуж ва ўзросце да 18 гадоў, 14 % становяцца жонкамі яшчэ да свайго 15-годдзя. Такая сітуацыя ў краінах з нізкім і сярэднім узроўнем даходу. Спецыялісты САЗ упэўнены, што, чым вышэйшы ўзровень адукацыі ў краіне, тым радзей сустракаецца ранняя цяжарнасць.

❺ Толькі 36 % хлопцаў і 24 % дзяўчат ва ўзросце ад 15 да 24 гадоў з краін з нізкім і сярэднім узроўнем даходу ведаюць пра тое, як абараніць сябе ад ВІЧ, паводле звестак САЗ.

❻ Пры гэтым сітуацыя ў развітых краінах таксама далёкая ад ідэальнай. Каля паловы амерыканскіх падлеткаў вядуць актыўнае палавое жыццё. Многія займаюцца сексам у маладым узросце, што павялічвае рызыку захворванняў, якія перадаюцца палавым шляхам, і падлеткавай цяжарнасці. Сярод прамыслова развітых краін у ЗША назіраецца самы высокі ўзровень падлеткавай цяжарнасці і падлеткавых абортаў.

❼ Статыстыка паказвае, што 8 з 10 бацькоў-падлеткаў не бяруць шлюб з маці свайго дзіцяці, і часта адносіны не доўжацца да першага дня нараджэння дзіцяці. 20 % гэтых маладых бацькоў уступаюць у новыя адносіны на працягу двух гадоў пасля спынення папярэдніх адносін і зноў становяцца бацькамі. Больш за 80 % падлеткаў у канчатковым выніку становяцца маці-адзіночкамі.

«Самае каштоўнае ў жыцці даецца бясплатна»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

І яшчэ з узростам разумееш: сям'я — гэта некалькі пакаленняў. Чым яна большая, тым мацнейшы падмурак у цябе пад нагамі. Асабіста я заўсёды адчуваў за спінай сваіх продкаў. У свой час вельмі хацеў, каб бабуля, ветэран вайны — Раіса Міхайлаўна Марозава, — убачыла нашага з Вікай першынца. Якая шчаслівая яна была, калі мы з жонкай прывезлі паказаць ёй Міцю! А потым і Саша, і Юра пазнаёміліся са сваёй прабабуляй. Памятаю, як здзівіўся Юра, калі яна надзела свае ордэны: «Тата, а прабабуля Рая — герой?» — спытаў ён у мяне.

Сёння ў мяне самога ёсць унучка Мацільда, якой два з паловай года. І калі гэты анёлак прыходзіць у госці, я разумею, як цудоўна, што яна з ранніх гадоў засвойвае: ёсць мама і тата, дзядулі і бабулі, а яшчэ прабабулі і прадзядулі.

ГАЛОЎНЫ ПРЫНЦЫП — НЕ НАШКОДЗЬ!

— Я заўсёды ставіўся да розных сістэм выхавання з пэўнай доляй іроніі. Колькі прыкладаў, калі ў выдатных бацькоў вырасталі нягоднікі, а ў бесталковых мам і тат, у нездаровым, здавалася б, асяроддзі — дастойныя людзі. Чаму так адбываецца? Не ведаю. Нараджэнне чалавека, станаўленне яго асобы, яго лёс — гэта, па-мойму, самая вялікая з існуючых загадак. І ўсё ж, безумоўна, я веру ў сілу бацькоўскага прыкладу. Дзеці штодня назіраюць, як бацька і маці ставяцца адно да аднаго, да навакольных, да працы і, як правіла, капіруюць іх паводзіны.

Важна, каб муж і жонка былі аднадушныя ў пытаннях выхавання. Калі адзін дазваляе нешта, а іншы забараняе — гэта вядзе да маніпуляцый з боку дзіцяці.

Часта чуеш, што сямейныя саюзы творчых людзей нетрывалыя. Не згодны. Мне здаецца, прафесійная прыналежнасць у гэтым не адыгрывае ніякай ролі.

З унучкай Мацільдай.

Вялікіх праблем у нас з сынамі і дачкой не ўзнікала. Я пазбягаў катэгарычных забарон: яны, як правіла, выклікаюць актыўнае супрацьдзеянне. Ніколі дзяцей не караў, стараўся размаўляць, тлумачыць. Мы з Вікай не навязвалі ім сваіх жаданняў, не перашкаджалі шукаць сябе, проста накіроўвалі, падтрымлівалі і дапамагалі. Напрыклад, дачка Саша ў свой час не магла вызначыцца, літаратуры ці маляванню аддаць перавагу. Звярталіся да спецыялістаў, якія яе прафесійна тэсціравалі, каб дапамагчы зрабіць правільны выбар. У выніку Саша паступіла ў Акадэмію мастацтваў, дзе вучылася ў народнага мастака Беларусі Барыса Герлавана. Сёння яна — мастак-сцэнограф, вельмі захопленая сваёй працай. Старэйшы, Дзмітрый, яшчэ ў школьныя гады хацеў зрабіць камп'ютарную дзіцячую супер-гульню, таму і стаў праграмістам.

Малодшы сын Юра марыў пра футбол. Шмат трэніраваўся. Але, магчыма, перагарэў. І вырашыў паступаць на рэжысуру. Спачатку я імкнуўся неяк адбіць у яго гэты намер. Але ўбачыў, з якой цікавасцю і ўпартасцю ён паглыбляецца ў класіку, чытае творы Дастаеўскага, Булгакава, Гогаля, Талстога, і зразумеў: не трэба яму перашкаджаць.

Пасля рэпетыцый і спектакляў, фізічна знаходзячыся дома, у думках я яшчэ нейкі час звычайна ў тэатры. Жонка часам пытаецца: «Ты калі дадому вернешся?»

Наогул, галоўны прынцып у адносінах бацькоў і дзяцей, на мой погляд, такі ж, як у медыцыне: не нашкодзь!. Навязванне нашчадкам сваёй волі нярэдка заканчваецца драмамі і канфліктамі. Мае бацькі не перашкаджалі мне выбіраць сяброў, прафесію, спадарожніцу жыцця. І я прытрымліваюся такіх жа поглядаў.

ЗНАЙСЦІ СЯБЕ

— Я скончыў тэатральны інстытут у 1991 годзе. Гэта быў складаны час. Многія з аднакурснікаў палічылі за лепшае заняцца не мастацтвам, а бізнесам. А я вырашыў: нішто не прымусіць мяне адмовіцца ад рэжысуры. І сёння задаволены сваім выбарам. Хаця прафесія складаная: на рэжысёры ляжыць адказнасць за вялікі калектыў. І калі табе не вераць, гэта падкошвае. Асабліва ўразлівы, пакуль малады і неспрактыкаваны. За гады працы з'яўляецца панцыр, які ратуе ад знешніх уколаў, але ўсё роўна яны часам адчувальныя. Застаюцца ў рэжысуры толькі тыя, хто не ўяўляе жыцця без тэатра. Ці перашкаджала мне маё прозвішча? Ці баяўся, што будуць параўноўваць з бацькам? Не. Разумеў, што крытэрый ацэнак у мастацтве — густ. Аднаму падабаецца спектакль у пастаноўцы Міхаіла Кавальчыка, а іншаму — Сяргея Кавальчыка. Галоўнае — быць цікавым гледачу. І я не бачу нічога страшнага ў тым, калі ў сям'і з'явіцца яшчэ адзін рэжысёр.

ВЫЛЕЧВАННЕ МАСТАЦТВАМ

— Тэатр існуе не адно тысячагоддзе. Калі б ён не быў патрэбны, даўно б знік. Спектаклі (і не толькі трагедыі, але і камедыі) ішлі нават у блакадным Ленінградзе! І сёння, нягледзячы на кінематограф, тэлебачанне, інтэрнэт, каласальную індустрыю забаў, людзі чамусьці па-ранейшаму наведваюць тэатр. Чаму? Арыстоцель лічыў, што сапраўднае мастацтва выклікае катарсіс, гэта значыць, ачышчэнне, абнаўленне чалавека. Я не веру, што спектакль здольны кардынальна змяніць кагосьці. Нават геніяльныя пастаноўкі наўрад ці могуць злосных зрабіць добрымі, велікадушнымі. Але разважлівых людзей мастацтва падахвочвае думаць, эмацыянальных — суперажываць, адгукацца на пачуцці герояў. Тэатр — гэта размова з гледачом. Няхай на некалькі гадзін, але чалавек пераключаецца са штодзённасці, асабістых праблем і клопатаў на гісторыі выдуманых персанажаў, хвалюецца за іх, плача і смяецца. Мастацтва пашырае кругагляд, дае надзею на найлепшае выйсце. Сам я таксама стараюся захоўваць у сабе веру ў лепшае, заряджаць аптымізмам і энергіяй навакольных.

Калі сужэнцы шануюць адносіны, то пры жаданні заўсёды можна знайсці выйсце, утаймаваць эгаізм, вырашыць супярэчнасці, захаваць стасункі.

Сяргей Міхайлавіч са сваімі бацькамі Міхаілам Станіслававічам і Эміліяй Міхайлаўнай і малодшым сынам Юрыем.

АДОЛЕЦЬ ЗЛО І НЕ СТАЦЬ ЛІХАДЗЕЕМ

— Як рэжысёр заўсёды выбіраю той драматургічны матэрыял, які знаходзіць водгук ува мне самім, дазваляе падзяліцца з гледачом сваімі разважаннямі. Напрыклад, рок-оперу «Граф Монтэ-Крыста» захацелася паставіць, таму што гэты персанаж Аляксандра Дзюма для мяне — сапраўдны герой. Ён цікавы запалам, сварыць унутранай барацьбой. З-за людской зайздрасці, злосці, здрады Эдмон Дантэс страціў усё: нявесту, сям'ю, свабоду. Цудам вырваўшыся з палону праз 17 гадоў, ён прагне адплаты. Але мяжа паміж перамогай справядлівасці і помстай вельмі тонкая. Добрыя намеры, як вядома, часам прыводзяць у пекла. Гэта ж вечнае пытанне: як пакараць зло і самому не стаць ліхадзеем. Часта ў казках герой адсякае тры галавы ў Змея Гарыныча, а замест іх з'яўляецца 6, а потым 9 новых. Дык ці трэба ўступаць са злом у адкрытае супрацьборства альбо яго трэба ігнараваць? Галоўнае, па-мойму, — больш актыўна рабіць дабро, звужаючы такім чынам прастору для разгулу цёмных сіл. А цану сабе, сваёй душы кожны даведаецца толькі па выніках, калі стане зразумела: добрага ці злога ён стварыў больш.

Увогуле, шчыра перакананы: усё, што можна купіць за грошы, — марнае, імгненнае, лёгка заменнае. А самае каштоўнае для чалавека — каханне, сяброўства, здароўе, талент і само жыццё — даецца бясплатна. І шанаваць трэба менавіта гэта.

Вольга ПАКЛОНСКАЯ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ

Организатор торгов:

ООО «ТрастАудитКонсалт»

(УНП 692017051), 222304, Минская обл., г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 2В, пом. 14, тел. (8029) 777-91-61.

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре ликвидации будут проведены **12.10.2023 г. в 15.00** по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 2В, пом. 14.

Подробное содержание спецификаций к лотам размещено на сайте: **www.truster.by**

Продавец: ООО «Фелиско» (УНП 192356085)

№ лота	Наименование предмета торгов	Начальная цена с учетом НДС, BYN
1	Рекламные вывески (14 наименований согласно специф. 1)	920,00
2	Мебель торговая (21 наименование согласно специф. 2)	1220,00
3	Комплект торгового оборудования магазина «Физкульт» (Немига) (согласно специф. 3)	3000,00
4	Компьютерная техника и оборудование (11 наименований согласно специф. 4)	2220,00
5	Комплект офисной мебели (7 наименований согласно специф. 5)	1020,00
6	Световой комплекс (согласно специф. 6)	360,00
7	Комплект торгового оборудования магазина «Физкульт» (Замок) (согласно специф. 7)	3520,00
8	Холодильники торговые (6 наименований согласно специф. 8)	955,00
9	Витрины торговые (4 наименования согласно специф. 9)	480,00
Имущество б/у, местонахождение имущества: г. Минск, Долгиновский тракт, 51Б		

Продавец: ООО «Спорт Фьюжн» (УНП 192663122)

№ лота	Наименование предмета торгов	Начальная цена с учетом НДС, BYN
10	Рекламные вывески (7 наименований согласно специф. 10)	1140,00
11	Торговая мебель и оборудование (14 наименований согласно специф. 11)	3490,00
12	ПЭВМ и электрооборудование (12 наименований согласно специф. 12)	2800,00
13	Торговые манекены и оборудование (18 наименований согласно специф. 13)	3140,00
Имущество б/у, местонахождение имущества: г. Минск, Долгиновский тракт, 51Б		

Продавец: ИООО «РСМТРАКС» (УНП 190632458)

№ лота	Наименование предмета торгов	Начальная цена с учетом НДС, BYN
14	Запасные части для грузовых автомобилей новые (согласно специф. 14)	23886,00
15	Офисная мебель (6 наименований согласно специф. 15)	468,00
16	Компьютерная техника (7 наименований согласно специф. 16)	513,00
17	Инструмент и оснастка для ремонта автотехники (18 наименований согласно специф. 17)	2520,00
18	Стеллажи универсальные (2 наименования согласно специф. 18)	675,00
19	Обогреватель на отработанном масле w59	400,00
Имущество б/у, местонахождение имущества: Минская обл., г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 2В, пом. 14		

Продавец: ООО «ИНФОРМАТЕК» (УНП 191768559)

№ лота	Наименование предмета торгов	Начальная цена с учетом НДС, BYN
20	Infilink XG 1000 Xm/5X 1000 Оконечная станция	9000,00
21	Комплект ЗИП для светодиодных экранов LWOWF5 и LWOWFD10: 8 модулей p10, 8 модулей p5, 4 блока питания, 2 приемные карты	1350,00
22	Компьютерная техника (2 наименования согласно специф. 19)	240,00
Имущество б/у, местонахождение имущества: Минская обл., г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 2В, пом. 14		

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 7779161.

Для участия в торгах необходимо в срок до 11.10.2023 15.00:

1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах по адресу: 222304, Минская обл., г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 2В, пом. 14 либо на электронную почту info@truster.by;

2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY88UNBS3012 2173 7000 0000 0933 в ЗАО «БСБ БАНК», код UNBSBY2X, код BPSBBY2X, получатель – ООО «ТрастАудитКонсалт», УНП 692017051.

Шаг торгов – 5 %, задаток – 5 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов.

Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 14 календарных дней со дня проведения торгов. Срок оплаты предмета торгов: не позднее 30 календарных дней со дня проведения торгов, если иное не установлено договором.

Извещения о ранее проведенных торгах – 08.02.2023, 27.02.2023, 14.04.2023, 12.06.2023, 05.08.2023.

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by
Продавец	ОАО «НКФО «Белинкасгрупп», 220028, г. Минск, ул. Либаво-Роменская, 23
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by

Предмет электронного аукциона: транспортные средства, бывшие в употреблении, расположенные по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 69-1

№ лота	Наименование	Год выпуска	Инвентарный номер	Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.
1	**VOLKSWAGEN CADDY PRACTIK 19277 г/н АР 8259-7**	2009	200172	**10 594,54**
2	**VOLKSWAGEN CADDY PRACTIK 1927701 г/н АС 0213-7**	2014	200382	**22 752,04**
3	**FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 29459-01 г/н АР 8099-7**	2011	200026	**10 348,97**
4	**FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 29459-01 г/н АР 8100-7**	2011	200027	**9 825,64**
5	**FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 29459-01 г/н АР 8111-7**	2011	200022	**11 483,92**
6	**FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 29459-01 г/н АР 8130-7**	2011	200050	**10 149,54**
7	**VOLKSWAGEN CADDY RYCAR 294544-03 г/н АР 8139-7**	2009	200060	**10 770,38**
8	**VOLKSWAGEN CADDY PRACTIK 19277 г/н АС 8176-7**	2014	200085	**24 468,20**
9	**VOLKSWAGEN CADDY PRACTIK 19277-01 г/н АР 8243-7**	2014	200195	**21 900,29**

Дополнительная информация по лотам: потенциальным покупателям рекомендуется перед участием в аукционе уточнить в органах ГАИ порядок постановки автомобилей на учет (ранее автомобили использовалась для инкассации и перевозки ценностей)

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN); БИК BELBBY2X. Получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки».** УНП 191 021 390. **Нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на валютные счета, указанные на сайте организатора аукциона**

Срок подписания договора купли-продажи	**10** рабочих дней после электронных торгов. **Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона**

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 5 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия.

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 30.08.2023

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 13.10.2023 г. с 10.00 по 12.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

